МОСКВА 19
УЛ. ФРУНЗЕ 10 ИН. ТУТ
СОВ. СТРОИТ. И ПРАВА

Комуністычная партыя (большэвікоў) Беларусі

ЗВЯЗДА

Орган ЦК і МККП(б)Б, ЦВК і СНК БССР

№ 90 (5764) | 18 красавіка 1937 г., нядзеля | ЦАНА 10 КАП.

Пролетарыі ўсіх краін, злучайцеся!

СЁННЯ Ў НУМАРЫ:

ПЕРАДАВЫ АРТЫКУЛ — Рэспубліка рыхтуецца да Першага мая.

ЧУЛА ПРЫСЛУХОЎВАЦЦА ДА ЗАКОННЫХ ПАТРАБАВАННЯЎ КОМУНІСТАЎ: І. Г., Жураўлёў — Вырасла актыўнасць комуністаў; А. Левін — Інструктарамі райкома не кіравалі; П. Гурскі — Выбары парторганаў у армейскіх большэвікоў.

Н. Крэнне — Чарльз Дарвін.

ХАТУ-ЧЫТАЛЬНЮ ЗРАБІЦЬ КУЛЬТУРНЫМ АЧАГОМ КАЛГАСНАЙ ВЁСКІ: А. Лось — Без кіраўніцтва і дапамогі; П. Кавалёў — Сумная сапраўднасць; Тр. Хадковіч — Калі надыйдзе вечар.

Я. Афанасьеў, І. Власенка — Забяспечым высокі ўраджай канюшыны.

Е. С., С. Г. — Дакумент, які из адбівае сапраўднасці.

Сара Фібіх — Успаміны аб Ю. М. Пэпе.

ЗА РУБЯЖОМ:

На франтах у Іспаніі;

Забастоўка польскіх гарнякоў;

Канфіскацыя зброі французскіх фашыстаў;

Пасяджэнне падкамісіі камітэта па неўмяшанню ў справы Іспаніі.

РЭСПУБЛІКА РЫХТУЕЦЦА ДА ПЕРШАГА МАЯ

Працоўныя нашай краіны рыхтуюцца да вялікага свята міжнароднай пролетарскай салідарнасці — Першае мая. Пад сцягам Сталінскай Канстытуцыі працоўныя краіны социялізма будуць дэманстраваць свае перамогі, сваю сілу, непахіснасць, веру ў перамогу, сваю маналітнасць, сваю любоў да геройчнай партыі Леніна—Сталіна і вялікага правадыра народаў любімага, роднага Сталіна.

І як заўсёды, аднаўляючы слаўныя традыцыі барацьбітоў за социялізм, стаханаўцы зноў высока ўзнімаюць сцяг социялістычнага спаборніцтва. Зноў і зноў лепшыя з лепшых рыхтуюцца да таго, каб перавысіць вытворчыя рэкорды, устаноўленыя імі-ж. Няма толькі зруху ў работнікаў наркаматаў. Нішто не турбуе іх—ні рашэнні Пленума ЦК ВКП(б), ні нездавальняючае выкананне плана першага квартала. Бесклопатнасць, пякучка, у радзе выпадкаў страта перспектывы, забыццё сваіх прамых абавязкаў у галіне кіраўніцтва стаханаўскім рухам — вось што характэрна для большасці прамысловых наркаматаў БССР. Вытворчы ўздым, які пачаўся знізу ў сувязі з падрыхтоўкай да Першага мая, наркаматамі не падхоплен. Гэту бесклопатнасць і забыццё сваіх прамых абавязкаў патрэбна неадкладна перамагчы, напружыць усе сілы к таму, каб ліквідаваць прарыў першага квартала.

Прамысловасць рэспублікі закончыла першы квартал 1937 года са значным невыкананнем плана. Мясцовая прамысловасць выканала квартальную праграму на 94,1 проц., прадпрыемствы Наркамлегпрома на 98,2 проц., на 1.411 тыс. руб. недадала прадукцыі харчовая прамысловасць. Дрэнна працавалі тэкстыльныя фабрыкі, якія выканалі план на 86,6 проц., абутковыя — на 94,2 проц., Балторф — на 79,2 проц. Таксама дрэнна працавалі і цагельныя трэсты, Будпромтрэст, хімічная прамысловасць. Некаторыя прадпрыемствы (масларобныя, макаронныя) працуюць ніжэй узроўню мінулага года.

Некаторыя поспехі 1936 года парадзілі ў кіраўнікоў заводаў, трэстаў і наркаматаў атмасферу самазадаволення, рапартаманіі і бестурботнасці. Гэта з усёй нагляднасцю ўстаноўлена на толькі што закончыўшыхся сходах актыва наркаматаў мясцовай, лёгкай і харчовай прамысловасці. Гэта-ж факт, што наркаматы не ведаюць дакладна, што робіцца на прадпрыемствах, якая дапамога ім патрэбна. Наркаматы з штабаў вытворча-тэхнічнага кіраўніцтва прадпрыемствамі, якімі яны павінны быць, у радзе выпадкаў ператварыліся ў бюракратычныя апараты, якія размнажаюць цыркуляры і нікому непатрэбныя паперкі. Наркаматы не ведаюць дакладна сваіх кадраў, не выхоўваюць іх палітычна, не трымаюць іх у стане большэвіцкай настарожанасці.

У рэзультаце перавыканання плана 1936 года і першых поспехаў стаханаўскага руху кіраўнікі многіх прадпрыемстваў зазналіся, абгарадзіліся кітайскай сцяной зазнайства і самасупакоенасці ад шырокіх мас стаханаўцаў і рабочых. Рад гаспадарнікаў замест таго каб стварыць стаханаўцам усе ўмовы для высокапрадукцыйнай работы ідуць па шляху набору лішняй рабочай сілы, штурмаў, перавыдаткавання фондаў зарплаты (цагельня № 3, торфзаводы). Гэта школная антызяржаўная практыка прыводзіць да падражання сабекошту прадукцыі, да значнай недагрузкі рабочых і абсталявання. Радакцыя атрымлівае штодзённа дзесяткі пісем, у якіх стаханаўцы скарджацца на няўважлівыя, пагардлівыя, нячулыя адносіны да іх. Гэтыя сігналы сведчаць аб тым, што рад кіраўнікоў прадпрыемстваў страцілі густ да стаханаўскага руху, перасталі ім кіраваць.

Прычыны прарыву ў рабоце прамысловасці ў першым квартале трэба шукаць яшчэ і ў тым, што значная частка партыйных работнікаў, якія раней празмерна захапляліся гаспадарчымі пытаннямі ў шкоду пытанням партыйна-палітычнай работы, цяпер шарахнуліся ў другую крайнасць — яны зусім перасталі займацца гаспадарчымі пытаннямі, не разумеючы, што «нельга шарахацца ад адной крайнасці да другой. Нельга аддзяляць палітыку ад гаспадаркі. Мы не можам адыйсці ад гаспадаркі таксама, як не можам адыйсці ад палітыкі». (Сталін).

Нашы партыйныя і гаспадарчыя арганізацыі, па-большэвіцку выкрываючы на аснове разгортвання крытыкі і самакрытыкі ўсе недахопы, промахі і прарывы ў сваёй рабоце, узброеныя гістарычнымі рашэннямі Пленума ЦК ВКП(б), дакладам і заключнай прамовай таварыша Сталіна, маюць усё неабходнае для таго, каб перамагчы адставанне, быстра рушыць наперад.

Для гэтага патрэбна перамагчы сваю ўласную бесклопатнасць, дабралушнасць і палітычную блізарукасць, палепшыць ва многа разоў большэвіцкае кіраўніцтва масамі, мабілізаваць іх на хутчэйшую ліквідацыю вынікаў шкодніцтва, на большэвіцкую пільнасць, на барацьбу за новыя вытворчыя перамогі.

Сустрэнем Першае мая новымі вытворчымі перамогамі ў прамысловасці, на транспарце, у сельскай гаспадарцы і гандлі!

Даб'ёмся новых стаханаўскіх рэкордаў!



НА ЗДЫМКУ: трактарная сеялка за работай у калгасе «Асвета» Клічаўскага раёна. Аграном тав. Стыдаль А. К. правярае якасць работы сеялкі.
Фото Я. Салавейчыка.

РАШУЧА ЗМАГАЦЦА З ЗАЦЯЖКАЙ І НІЗКАЙ ЯКАСЦЮ СЯЎБЫ

У ПОЛАЦКАЙ АКРУЗЕ СЯЎБОЙ НЕ КІРУЮЦЬ

У раёнах Полацкай акругі ўстанавілася добрае надвор'е, якое спрыяе разгортванню сяўбы ў кожным калгасе. Не гледзячы на гэта, сяўба ў акрузе недапушчальна зацягваецца. Ні адзін раён яшчэ не прыступіў да масавай сяўбы. На 10 красавіка па Полацкай акрузе засеяна яравымі ўсяго 234 гектары. У Асвейскім-жа раёне засеяны 4 гектары. Тут не толькі не сеюць, але і не рыхтуюць глебы. Сяўба адкладаецца на апошні час.

— Макравата, замаразкі, сеяць ранавата, — разважае старшыня асвейскага райвыканкома Мартынаў і загадчык райземаддзела Альхоўскі.

У Асвейскім раёне не адчуваецца непакою. У большасці калгасаў на полі працуюць асобныя калгаснікі, недастаткова выкарыстоўваецца цягавая сіла. Усюды толькі разважаюць, што, моў, мокра і таму нельга сеяць. У гэту пару глеба з кожным днём усё больш прасыхае і тубляе вільгаць.

Вось калгас «Кастрычнік». Па думцы кіраўнікоў раёна, гэта — перадавы калгас. А на самой справе ён яшчэ зусім не гатоў да сяўбы. Толькі 10 красавіка брыгадзір прыняўся падганяць збрую да коней і замацоўваць іх за калгаснікамі. Насенне не падрыхтавана, мае вялікую засмечанасць пустазеллем, ільнасемя заражана павілікай. Фармалін і хімікаты для пратручання насення не завезены.

Першыя дні палявых работ у большасці калгасаў Расонскага раёна паказалі абсалютную непадрыхтаванасць да сяўбы. Па раёну вывезена на 38 процантаў гною і загатоўлена 37 проц. торфу. Як толькі пачалі палявыя работы, вывазку ўгнаення і загатоўку торфу зусім спынілі. Не закончан таксама абмен насеннем. 308 цэнтнераў гатункованага ільнасемя ляжыць на складзе. Між тым, у многіх калгасах насенне непрыгоднае для сяўбы. У калгасе «Прабуджэнне» ільнасемя мае толькі 42 проц. усхожасці; у калгасе «Новая праца» ўсхожасць гароху складае 30 проц. Калгасы не забяспечаны хімікатамі для пратручання насення. З 128 калгасаў толькі 10 выкупілі прэпарат Давыдава.

Справа з завозам хімікатаў, асабліва фармаліну, па ўсёй акрузе абстаіць дрэнна. У Дрысенскім раёне з-за адсутнасці фармаліну затрымліваецца сяўба аўса. Калгас «Профінтэрн» падрыхтаваў 45 гектараў для пасеву, калгас «Ільіч» — 50 гектараў, а авёс ляжыць непратручаным і яго нельга сеяць. Акруговы земельны аддзел праявіў у гэтых адносінах злачынную бяздзейнасць. Толькі 11 красавіка быў прывезен на адной аўтамашыне фармалін для ўсіх раёнаў акругі, што не магло задаволіць і трэцяй часткі патрэбнасці. Адсутнасць фармаліну прыводзіць да зрыву сяўбы ў Ветрынскім раёне.

У многіх калгасах вельмі дрэнна арганізавана праца на полі. У калгасе «Кастрычнік» Асвейскага раёна, у адной брыгадзе выбраны два брыгадзіры, і ні адзін з іх не кіруе палявымі работамі. Штодзень больш 10 мужчын хозяйн на возера вудзіць рыбу. У некаторых калгасах працуюць скопам, брыгадзіры не абмяркоўваюць участкі і несвоечасова іх правяраюць. У калгасе «Кастрычнік» Ветрынскага раёна, тры сеялкі стаяць неспраўнымі, сяўба затрымліваецца. Тут падрыхтавана толькі 75 гектараў глебы і нічога не засеяна.

Полацкія раённыя і акруговыя арганізацыі замест штодзённага кіраўніцтва сяўбой заняліся парадным шуміхай і балбатнёй, збіраюць у раённых цэнтрах злёты і сходы, адрываючы калгаснікаў ад палявых работ. Ні раённыя, ні акруговыя арганізацыі не адчуваюць адказнасці, якую яны нясуць за сяўбу ў акрузе.

Т. ЛЯСОВІЧ, Е. ТРУШЧАНКА.

СТАХАНАЎЦЫ НА ВОРЫВЕ І СЯЎБЕ

На калгасных палях Кавалёўскага сельсовета, Бабруйскага раёна разгарнулася социялістычнае спаборніцтва за своечасовае і высокаякаснае правядзенне сяўбы. Кожны брыгадзір паставіў перад сабой задачу — правільна арганізаваць працу, правесці сяўбу па-большэвіцку.

Першым у разгортванні палявых работ ідзе калгас «Перамога № 2». Да вясны тут старанна рыхтаваліся. Загадзя на палі вывезены гной, за калгаснікамі замацаваны коні і інвентар. План веснавых работ быў распрацаваны на вытворчых брыгадных нарадах. У брыгадах устанавілі індывідуальную адзельшчыну, якая падняла прадукцыйнасць працы.

З першых дзён палявых работ большасць калгаснікаў выконваюць нормы на 200—250 процантаў. Лепшыя стаханаўцы Харанёнка Павел, Ермоленка Іван, Дамакур Іван, Ермоленка Васіль, Бабкоў Васіль і іншыя ўзорваюць па 0,70—0,80 гектараў. Конская цягавая сіла ў добрым становішчы.

На сяўбе арганізавана культурнае абслугоўванне калгаснікаў. Выпісваюцца газеты, кнігі, журналы. Сярод калгаснікаў праводзіцца масавая работа.

І. МЕЛЬНІЧОНАК.

Добраякасна пасеялі яравыя

КАМАРЫН. Калгас «Ленінскі шлях», Чыкалавіцкага сельсовета, да 5 красавіка засеяў шпаніцай 41 гектар, ячменем 41,38 гектараў, аўсом 82 гектары, з якіх на балоце пасеяна 45 гектараў, ільном 16 гектараў, канюшынай 8,75 гектараў, гарохам 3,08 гектара. Усе культуры пасеяны канцыцыйным, гатункоўным, пратручаным насеннем на добра ўгноенай і апрацаванай глебе.

Пад яравыя культуры вывезена 8.168 тон торфу, чыстага адабранага вівіяніту 17 тон, попелу 80 цэнт., курынага памёту 60 цэнт., гною 5 тысяч тон.

Раўковай сеялкай пасеялі поўнасцю шпаніцу і ячмень. Усю сяўбу і апрацоўку глебы старшыня калгаса прыняў па акту.

Калгас абавязаўся атрымаць у гэтым годзе ў сярэднім па ранніх яравых культурах 19—20 цэнт. з гектара, ільновалакна 5 цэнт.

Звеннявая калгаса У. Мельнік абавязалася дабіцца рэкорднага ўраджаю — ячменю 35 цэнт. з плошчы ў поўгектара, па 35 цэнт. шпаніцы і аўса з плошчы 0,25 гектара і з плошчы 0,15 гектара 12 цэнт. ільновалакна.

За 12 цэнт. ільновалакна з гектара на плошчы ў 2,12 гектара змагаецца 72-гадовы Шэўчанка.

Зараз у калгасе барануюць азімыя і падкармліваюць іх курыным памётам, а таксама пачалі пасадку бульбы на высокіх мясцах.

ЧМЫРОЎ — старшыня калгаса,
БАРЗДОЎ — агранам.

АБ ГАЛОЎНЫМ НЕ СКАЗАЛІ

Чатыры вечары працягваліся спрэчкі па справаздачы прэзідыума Менскага горсовета. Выказалася 42 чалавекі са 101 запісаўшагася. Выступаўшыя ўскрылі шматлікія факты абураючага бюракратызма, пяганіны і падхалімства ў апараце горсовета, гнілых парочных метадаў кіраўніцтва, агідная запушчанасці совецкай работы.

Дзесяткі наведвальнікаў прыходзяць штодзённа ў горсовет з розныімі заявамі і скаргамі. Яны хочуць пагаварыць са старшынёю, з сакратаром або членам прэзідыума. Але дабіцца прыёму ў тав. Жуковіча і нават у загадчыкаў аддзелаў — вельмі цяжкая справа. Людзі чакаюць па 4—5 гадзін, і, нарэшце, уходзяць ні з чым. Назаўтра яны зноў прыходзяць і нярэдка таксама не пападаюць на прыём.

Бюракратычныя рагаткі, якімі адгарадзіліся кіраўнікі горсовета ад мас, настолькі моцныя, што не толькі радавы выбаршчык, але нават дэпутат горсовета не можа прайсці праз іх.

— Я некалькі разоў прабавала зайсці да тав. Жуковіча, — расказвае дэпутат тав. Гурына (фабрыка імя Куйбышэва),— але мяне не пусцілі. Нават да сакратара горсовета тав. Казлоўскага цяжка даступіцца.

З выступлення тав. Гурынай і іншых узельнікаў пленума выявілася таксама, як горсовет механічна залічваў дэпутатаў «раз назаўсёды» ў актыў і пасіў. Дэпутат можа на працягу доўгага часу нічога не рабіць, але калі ён ужо аднаго разу быў занесен у спіс актывістаў, ён заўсёды будзе лічыцца такім. І наадварот, залічаны ў пасіўныя, як-бы актыўна потым ні працаваў, яму ўсёроўна не пазбавіцца ад прыклеенага аднойчы ярлыка. Так у горсавеце за спісамі і пратаколамі не бачаць жывых людзей, так «кіруюць» работай дэпутатаў.

Тое-ж самае і з секцыямі і дэпутацкімі групамі.

— Чыгуначная секцыя, — кажа тав. Іваноў (завод імя Мяснікова), — фармальна існуе, але фактычна яна ўжо два гады не працуе. Гэта не перашкаджае прэзідыуму ў сваіх справаздачах апераваць «работай чыгуначнай секцыі».

Абурэнне ўдзельнікаў пленума выклікала выступленне намесніка загадчыка горкамгаса Гальперына. Іменна ў апараце горкамгаса асабліва квітнее бюракратызм і напляванельскія адносіны да наведвальнікаў. Аб грубасці і самадурстве самога Гальперына не раз пісалася ў друку, аб гэтым пішацца і ў шматлікіх скаргах працоўных.

І вось — Гальперын на трыбуне пленума. Спачатку ён прабуе абыйсці моўчкі работу горкамгаса і свае асабістыя недахопы. Але з залы пасыпаліся рэплікі, і Гальперын прымушан быў загаварыць і аб сабе. Аказваецца, не ён вінават ва ўсіх агіднасцях, а вінаваты... самі наведвальнікі (?!). Што датычыць далейшай работы, то ён ужо, уласна кажучы, перабудаваўся.

У чым-жа заключаецца «перабудова» Гальперына? Аказваецца, ён стаў «маўчальнікам». З непераладвальным цынізмам расказвае ён пленуму:

— Я перастаў гаварыць з наведвальнікамі. Каб не сказаць каму-небудзь грубасці, я проста маўчу. Наведвальнік можа гаварыць колькі хоча, а я яму нічога не адказваю.

Ці трэба даказваць, што гэта па сутнасці яшчэ больш утончаная здзекі над выбаршчыкамі. Ці не ясна, што гэта, з дазволу сказаць, «перабудова» ёсць нішто іншае, як грубае апашленне самой ідэі перабудовы.

На пленуме выступалі і іншыя загадчыкі аддзелаў горсовета (тт. Саф'яп, Шульп, Кузняцова і інш.). Усе яны крытыкавалі работу прэзідыума горсовета, прызнавалі тое, што ўжо даўно даказана і чаго нельга не прызнаваць. Але ні адзін з загадчыкаў не сказаў канкрэтна, як ён мяркуе перабудаваць работу свайго аддзела, як практычна будзе выпраўляць велізарныя недахопы.

Не сказаў аб гэтым і тав. Жуковіч у сваім заключным слове. Апошняе паказала, што кіраўнікі горсовета не зрабілі яшчэ належных вываадаў з рашэнняў Пленума ЦК ВКП(б) і ўказанняў таварыша Сталіна, не намецілі канкрэтных шляхоў да рашучага павароту.

С. ГАЛКІН.

ІГНАРУЮЦЬ КОНСКУЮ ЦЯГАВУЮ СІЛУ

Загадчык Рагачоўскага райземаддзела тав. Змушко, старшыня райвыканкома тав. Зялёнка жывое кіраўніцтва калгасамі, брыгадамі падмянілі тэлефоннымі званкамі, пасеўнымі нарадамі і пастановамі.

Сяўба ў раёне яшчэ не разгарнулася. Тэлефонныя размовы і ўгаварванні загадчыка райземаддзела, каб пачыналі сеяць, не даюць вынікаў. З сямі калгасаў Побалаўскага сельсовета толькі калгас «Перамога» (старшыня калгаса тав. Кутуеў) распачаў сяўбу.

Астатнія калгасы сельсовета з сяўбой не спяшаюцца. У калгасе «Аганёк» (старшыня Жлановіч) не вывезен гной, не прабаранавана ніводнага гектара жыта. На палявыя работы выходзіць толькі 12 чалавек. Недалёка адышоў і калгас імя Варашылава. Старшыня гэтага калгаса тав. Гаварушка лічыць дасягненнем, што прабаранавана 20 гектараў жыта з 280. Ворыва пад яравыя культуры яшчэ не пачыналі.

Не могуць пахваліцца поспехамі работы і старшыні калгаса імя Тальмана — тав. Хвашчынскі, імя Галадзела — тав. Захаркоў, імя Чырвонай Арміі — тав. Зубер. Яны роўнадушна адносяцца да зацяжкі сяўбы.

— Часу яшчэ хапае, — разважаюць яны, — пасеем не да першага мая, дык да 10, а не да 10, дык к канцу мая.

У калгасах Побалаўскага сельсовета працуюць тры трактарныя брыгады Рагачоўскай МТС.

Бачачы на сваіх палях значную колькасць трактароў, калгасы сельсовета ігнаруюць на апрапоўны глебы конскую сілу, гаворачы, што з сяўбой справяцца адны трактары. Гэта выключна школная тэндэнцыя шырока распаўсюджана сярод старшынь калгасаў.

Такое становішча з сяўбой не толькі ў калгасах Побалаўскага сельсовета. У калгасах Дварэцкага, Рагачоўскага, Лучынскага, Шіхінінкага сельсоветаў засеяна ўсяго ад 5 да 15 гектараў.

Т. ХАТКЕВІЧ.

Безадказныя адносіны да важнейшай справы

Для калгасаў Чавускага раёна з дзяржаўнага фонда адпушчана пазыка — 100 тон сена. Гэта сена павінна была адгрузіць для раёна магілёўская кантора Заготсена. Але апошняя апісалася безадказна, па-бюракратычнаму да важнейшай палітычнай справы і на працягу доўгага часу сена так і не адгружала.

Нарэшце, чавускі райза, каб атрымаць вызначаную пазыку, вымушан быў паслаць свайго прадстаўніка. Аднак, косная і бюракратызм не ўдалося ламаць даўт тады, калі прыехаў прадстаўнік райза. Кіраўнікі магілёўскай канторы Заготсена 12 дзён займаліся цяганінай, а справу так і не вырашылі.

Начальнік магілёўскай чыгункі і экспедытар Логвінава аказаліся таксама ў палоне гэтых бюракратаў. Яны павінны былі прадставіць 7 вагонаў для пагрузкі сена, але гэтага не зрабілі.

Такім чынам, важнейшае ўказанне партыі і ўрада ігнаруецца. Кіраўнікі з магілёўскай канторы Заготсена і чыгункі забыліся, што яны нясуць адказнасць за зрыў мерапрыемстваў, ад якіх залежыць поспех веснавой пасеўнай кампаніі.

КАРНЕЕНКА.

У ЦВК і СНК СССР

Цэнтральны Выканаўчы Камітэт і Совет Народных Камісараў СССР пастанавілі скасаваць падзел індывідуальных платнікаў адзінай дзяржаўнай пошліны на дзве катэгорыі (працоўныя і іншыя асобы). З усіх іскавых заяў паноўю да 5 тысяч рублёў па справах, якія праводзяцца ў судовых установах, устаноўлены наступныя адзіныя для ўсіх грамадзян, а таксама для дзяржаўных, кааператыўных, грамадскіх і прыватных арганізацый стаўкі дзяржаўнай пошліны:

Пры цане іска да 200 рублёў—3 рублі з кожнай заявы:

пры цане іска ў 200 рублёў і звыш да 500 рублёў—5 рублёў з кожнай заявы:

пры цане іска ад 500 рублёў да 5000 рублёў — 2 проц. ад цаны іска.

З іскавых заяў па спрэчках калгасаў паміж сабой і спрэчках калгасаў з дзяржаўнымі і кааператыўнымі арганізацыямі дзяржаўная пошліна захоўваецца ў памеры 1/4 проц. іскавой сумы, незалежна ад цаны іска.

(БЕЛТА).

У прэзідыуме ЦВК Саюза ССР

17 красавіка пад старшынствам тав. Г. І. Петроўскага адбылося пасяджанне прэзідыума ЦВК Саюза ССР. На гэтым пасяджанні ленінскаму комсамолу, узнагароджанаму за праяўленую ініцыятыву ў справе ўдарніцтва і социялістычнага спаборніцтва, быў уручан орден Працоўнага чырвонага сцяга.

Орден прымаюць сакратары Цэнтральнага Камітэта ВЛКСМ т.т. Косарэў, Лук'янаў, Файнберг, Вершкоў, Пікіна і Васільева.

Тав. Косарэў выступае з кароткай прамовай:

— Ленінскі комсамол ад нашага роднага ўрада сёння за асаблівыя заслугі атрымлівае другі орден. Першы орден ленінскі комсамол атрымаў за заслугі на франтах грамадзянскай вайны. Гэты орден, уручаны нам па даручэнню ўрада тав. Петроўскім, ленінскі комсамол атрымлівае за заслугі на франтах социялістычнага будаўніцтва.

Мільёны нашай адважнай, мужнай моладзі цэняць і ганарацца ўвагай, якую ўдзяляе ім наш урад. Тав. Петроўскі, гэтым орденам мы будзем даражыць, як даражым гонарам вялікай социялістычнай рэволюцыі.

Ад імя мільёнаў моладзі вялікае дзякуй нашаму ўраду за ўвагу і за тую высокую ацэнку, якую ён дае нашай рабоце.

Затым уручаюцца ордэны камандзірам і палітработнікам Чырвонай Арміі, палярнікам, лётчыкам, пагранічнікам, работнікам авіяцыйных заводаў №№ 1 і 21, героям грамадзянскай вайны, работнікам транспарту, харчовай індустрыі, а таксама групе калгаснікаў-веласіпедыстаў, якія зрабілі велапрабег Коларадо—Хабараўск даўжынёю ў 9.764 кілометры. Тав. Г. І. Петроўскі горача віншуе ўсіх узнагароджаных.

МІТЫНГ ЛЯ ФІНЛЯНДСКАГА ВАКЗАЛА Ў ЛЕНІНГРАДЗЕ

ЛЕНІНГРАД, 17 красавіка. (БЕЛТА). Сёння на плошчы каля Фінляндскага вакзала адбыўся шматлюдны мітынг, прысвечаны 20-годдзю прыезду В. І. Леніна з эміграцыі і апублікавання гістарычных красавіцкіх тэзісаў.

Плошча і вуліцы, якія да яе прылягаюць, запоўнілі калоны працоўных Ленінграда, чырвонаармейцаў і маракоў Балтыкі.

На мітынгу з успамінамі выступілі тт. Позерн, Бліноў (кіраўскі завод), Колбін (ваенна-морская акадэмія), Шышкін (завод імя Леніна) і Собалеў (Краснагвардзейскі райком ВКП(б).

VI ПЛЕНУМ ВЦСПС

27 красавіка 1937 г. склікаецца VI пленум ВЦСПС з наступнай павесткай дня:

1. Аб справаздачах профорганаў у сувязі з выбарамі апошніх.

Дакладчык тав. Швернік.

2. Аб праекце статута прафесіянальных саюзаў.

Дакладчык тав. Еврэінаў.

3. Інструкцыя па выбарах профсаюзных органаў.

Прэзідыум ВЦСПС.

ЧУЛА ПРЫСЛУХОУВАЦЦА ДА ЗАКОННЫХ ПАТРАБАВАННЯУ КОМУНІСТАЎ

Вырасла актыўнасць комуністаў

ВІЦЕБСК. Справаздачна-выбарчыя сходы па нашай Віцебскай партыйнай арганізацыі падыходзяць к канцу. З 166 первічных партарганізацый раёна справаздачна-выбарчыя сходы на 14 красавіка прайшлі ў 144 арганізацыях (не ўключаючы чыгуначны вузел).

У першы час асобныя партарганізацыі (Трамвайны парк, фабрыка імя Лекерта, Днепрадзвінскае параходства і інш.) дапусцілі парушэнне пісьма ЦК ВКП(б) аб парадку выбараў парторганаў. У партарганізацыях, напрыклад, Днепрадзвінскага параходства і фабрыкі імя Лекэрта абмежавалі абмеркаванне кандыдатур у склад парткомаў. Рашэннем гаркома партыі ў партарганізацыях, дзе дапусцілі парушэнне пісьма ЦК ВКП(б), выбары былі адменены і праведзены паўторна. У асобных арганізацыях дапушчаныя памылкі былі выпраўлены тут-жа на сходах.

Партыйныя сходы паказалі небывалую дагэтуль высокую актыўнасць комуністаў. Узброеныя гістарычнымі дакументамі — рашэннем лютаўскага Пленума ЦК ВКП(б) і дакладам таварыша Сталіна,—комуністы востра і смела крытыкуюць недахопы ў рабоце сваіх парткомаў і гарадскога камітэта партыі, яго сакратароў. Прыводжу некалькі характэрных лічбаў па 109 первічных арганізацыях, характарызуючых узросшую актыўнасць комуністаў. З прысутных на партсходах 1.673 комуністаў і кандыдатаў партыі ў абмеркаванні справаздач парткомаў прыняла ўдзел 1.255 чалавек (усяго было запісана ў спрэчках 1.365 чалавек). Аднак гэта толькі пачатак. Нам прадстаіць яшчэ многае зрабіць у справе шырокага разгортвання большэвіцкай крытыкі і самакрытыкі.

Асабліва вялікая актыўнасць комуністаў была ў часе абмеркавання кандыдатур у склад парткомаў і парторгаў. Кожная кандыдатура абмяркоўвалася ў святле яе адданасці справе партыі Леніна—Сталіна, яе здольнасці кіраваць партыйнай арганізацыяй. Па 95 партыйных арганізацыях з 553 кандыдатур, высунутых у парткомы і парторгі, адведзена 216.

Выбары партыйных органаў шляхам тайнага галасавання выявілі значны рэзерв новых партыйных кадраў. Па 35 арганізацыях, дзе ёсць парткомы, з 171 члена парткомаў абрана 68 новых таварышоў, якія раней не з'яўляліся членамі парткомаў. З 35 сакратароў парткомаў— новых 9 чалавек. З 96 партыйных арганізатараў — новых 24.

Выхаванне гэтага новага рэзерва, аказанне практычнай дапамогі первічным партарганізацыям у іх штодзённай рабоце, улічыць і рэалізаваць прапановы, высунутыя комуністамі ў сваіх выступленнях — усё гэта з'яўляецца базавой неадкладнай задачай усёй нашай Віцебскай партыйнай арганізацыі. Да гэтай канкрэтнай работы, трэба прама сказаць, мы яшчэ не прыступілі, калі не лічыць асобныя первічныя партарганізацыі (завод імя Кірава, фабрыка «Сцяг індустрыялізацыі»), дзе ўжо ў гэтым напрамку пачалі правоздіць паўную работу.

Сакратар Віцебскага гаркома КП(б)Б.
І. Г. ЖУРАЎЛЁЎ.

ІНСТРУКТАРАМІ РАЙКОМА НЕ КІРАВАЛІ

ГЛУСК. У другі і трэці дзень схода крытыка была больш вострай.

Крытыцы падвергліся не толькі работа бюро і сакратара райкома, але і ЦК КП(б)Б. Тав. Пракопчык, крытыкуючы работу райкома, гаворыць:

— Слаба кіравалі сакратар і бюро райкома работай інструктароў. Не ўсе члены бюро працавалі, як належыць. Недазвальняюча кіраваў работай інструктароў адзел кіруючых парторганаў ЦК КП(б)Б. Інструктара ЦК мы рэдка бачылі. Калі прыехалі інструктары ЦК таварышы Екельчык і Скарабагацька, яны з намі, інструктарамі, нават не пагаварылі. Яны гаварылі толькі з сакратаром райкома.

Інструктар райкома тав. Кабяка гаворыць, што з інструктарамі сакратар райкома не праводзіў ніякай работы. Дакладаў аб нашай рабоце на бюро не заслухоўваюць. У нас не дапамагаюць у рабоце радавым комуністам.

Тав. Кабанчук крытыкаваў работу рэдакцыі райгазеты. Ёсць вышадкі, калі рэдакцыя не правярае матэрыял і змяшчае яго. Аб слабай рабоце з масамі гаварылі тт. Пракопчык, Казак, Чарнагубаўскі і Пермінаў.

— Бюро райкома, — гаворыць тав. Рудніцкі, — больш засядала, чым працавала. Працавала яно штуршкамі: калі прыдзе тэлеграма ЦК, тады заварушацца. А потым зноў чакаюць тэлеграмы. Так было з выкананнем плана дарожнага будаўніцтва, так з лесавывазкай і з сяўбой. Сапраўднай крытыкі і самакрытыкі ў нас няма. Баяцца крытыкаваць недахопы кіраўнікоў раёна. Калі пакрытыкуеш начальства, дык потым адзёргваюць.

— Інструктары ЦК лічаць сябе вялікімі начальнікамі,—гаворыць т. Гарбузоў.— Іх нават нельга крытыкаваць. Калі я крытыкаваў інструктара сельгасаддзела ЦК тав. Лахмана за гаслаўлёрства па сельсоветах раёна, мяне выклікалі за гэта ў ЦК і важна напомнілі, што Лахман — інструктар ЦК, чым далі мне зразумець, што патрэбна крытыкаваць аспярожна.

У спрэчках па дакладу сакратара райкома запісалася 70 чалавек. Выказалася 48 таварышоў. Спрэчкі працягваюцца.

А. ЛЕВІН.

Як у Клімавічах адмянілі партвучобу

5, 10, 15, 20, 25 і 30 кожнага месяца — дні вучобы ў сетцы партыйнай асветы Клімавіцкай партыйнай арганізацыі. 15 красавіка павінны былі праводзіцца заняткі ва ўсіх школах раёна. Комуністы рыхтаваліся да заняткаў. 12 красавіка вечарам адбылося паседжанне бюро райкома партыі. На гэтым паседжанні комуністы горада былі прымацаваны да калгасаў для дапамогі ў правядзенні веснавой сяўбы. Тут-жа было дана ўказанне назаўтра раніцай выязджаць і сядзець у калгасах без права выезду да 1 мая.

Адзін з прысутных комуністаў асмеліўся запытаць у сакратара райкома,—а як-жа з партыйнай вучобай? Ці можна будзе 15 красавіка прыехаць вечарам на заняткі? Прадстаўнік ЦК КП(б)Б тав. Нізаўцаў, які ўзялічнічаў на пасяджэнні бюро райкома, узняўся ва ўвесь рост і грамавым голасам, не дапускаючы супярэчання, загадаў:—Ніякіх школ. Захаліце з сабой падручнікі, і калі не будзе чаго рабіць — загляніце ў іх.

У райкоме партыі стварыўся школы настрой, што партыйная вучоба несумяшчальна з задачамі правядзення сяўбы. Так, работу партыйных школ 15 красавіка сарвалі па віне і са згоды бюро райкома партыі.

КАГАН.

Палітрук Н-скай часці тав. А. В. Ткачоў гутарыць з калгаснікамі калгаса «Чырвоная змена» Барысаўскага раёна аб дакладзе таварыша Сталіна на Пленуме ЦК ВКП(б).
Фото Я. Салавейчыка.

ВЫБАРЫ ПАРТОРГАНАЎ У АРМЕЙСКІХ БОЛЬШЭВІКОЎ

Буйныя недахопы ў партыйна-палітычнай рабоце, грубыя парушэнні статута партыі, асноў унутрыпартыйнай дэмакратыі, выкрытыя Пленумам ЦК, мелі месца і ў арганізацыях армейскіх большэвікоў. Так, напрыклад, у арганізацыі, дзе адказным сакратаром партыйнага бюро т. Драбіленка, бюро не адчувалася перад комуністамі з 1934 г. У складзе бюро не асталося ні аднаго з членаў абраных на мінулых выбарах. Цікава адзначыць прапэдуру «выбараў» адказнага сакратара тав. Драбыленка. Выклікае яго ранейшы адказны сакратар т. Іваноў і гаворыць: «прымай справы». Довады Драбіленка, што ён не член бюро, што наогул арганізацыя будзе «адмоўна» рэагаваць на такія «выбары», не ўзвдзейнічалі.

— Пытанне ўзгаднілі,—лаканічна заявіў Іваноў, — што датычыць «выбараў» цябе ў бюро, — пастаў пытанне на бліжэйшым сходзе. Іваноў «забыўся» адчытацца перад партыйнай арганізацыяй і паехаў, а Драбіленка стаў адказным сакратаром. Парторгі падраздзяленняў Іваноў, Мельнікаў, Захараў, следуючы прыкладу адказнага сакратара, таксама не адчытваліся перад сваімі арганізацыямі.

Партыйная работа палмянялася адміністраваннем. У адной з арганізацый справа дайшла да таго, што партыйны сход выносіў рэзалюцыю: «Даручыць т. Гуйван... зрабіць піраміды для аружжа». Парушэнне статута вялі да ўшчамлення правоў членаў партыі і да забыцця работы з кожным комуністам паасобна. Выявілася, напрыклад, што кандыдат у члены партыі тав. Кукуеў 7 месяцаў не плаціў членскіх узносаў. Лёгка ўявіць сабе, як дапамагала партарганізацыя выхаванню якасцей большэвіка ў кандыдата ў члены партыі т. Кукуева. Усе гэтыя заганы атрымалі суровую ацэнку большасці комуністаў, якія выступалі ў спрэчках і бязлітасна, не глядзячы на асобы, крытыкавалі работу сваёй арганізацыі.

Два дні ішло абмеркаванне справаздачы. Гэтыя дні былі выдатнай школай палітычнага выхавання комуністаў. Маладыя большэвікі, а іх у арганізацыі нямала, вучыліся на гэтым сходзе большэвізму, непрымірымасці да памылак.

Выбары ў склад бюро метадам тайнага галасавання былі ў арганізацыі добрай праверкай як той ці іншы комуніст звязан з партыйнай масай, дзейсным сродкам небывалага ў жыцці арганізацыі над'ёму палітычнай актыўнасці членаў і кандыдатаў партыі. Усебакова, з асаблівым упорам на выяўленне палітычнага твару і практычнай годнасці да работы, абмяркоўвалі комуністы кожную кандыдатуру, якая выстаўлена ў склад бюро. Тэхнічныя бакі тайных выбараў у арганізацыі правялі ў суровай суадпаведнасці з патрабаваннямі ЦК, памятаючы аб тым, што такое захоўванне тэхнікі выбараў — палітычны абавязак кожнай партарганізацыі. У склад бюро абраны праверэныя таварышы, дастойныя высокага гонару, аказанага ім партарганізацыяй.

Армейскія большэвікі заўсёды былі адзнымі з самых стойкіх, самых перадавых атрадаў нашай партыі. Зараз на ўмовах гістарычнага павароту ў палітычным жыцці краіны, узброеныя рашэннямі Пленума ЦК, яны з большэвіцкай чэснасцю і праматой, агнём дзейснай творчай самакрытыкі вымятаюць са сваіх арганізацый усё чужое большэвізму.

П. ГУРСКІ.

ПАЛІТЫЧНЫЯ СЛЯПЦЫ З ЦК МОПР'а

У ЦК МОПР'а БССР доўгі час працаваў Залманаў, якога ўстроіў яго сваяк сакратар ЦК МОПР'а Рольбін. Комуністы неаднаразова ўказвалі Рольбіну і парторгу Гохману на тое, што Залманаў жулік і растратчык мопраўскіх сродкаў.

Толькі пасля ўмяшання Варашылаўскага райкома Залманаў быў знят з работы.

Гохман, як парторг, увесь час замазваў учынак Рольбіна і недарма. У ЦК МОПР'а БССР ёсць уласны дом, якім загадваў Гохман. Пры перадачы маемасці дома ў яго аказаўся недахоп маемасці больш чым на 700 руб. Аб гэтым бухгалтар дакладваў Рольбіну. Аднак, ён чамусьці ўжо некалькі месяцаў трымае справу растраты Гохманам дзяржаўнай маемасці пад сукном і нават калі бухгалтар т. Берсон склада акт аб недахопе маемасці і перадала Рольбіну, каб ён пазнаёміўся і перадаў старшыні ЦК МОПР'а т. Ляўкову, гэты акт быў зацёрт і аб агіднасцях, якія тварыліся ў ЦК МОПР'а, Ляўкоў не ведае.

Гохман прытупіў большэвіцкае пачуццё, і толькі гэтым можна растлумачыць, што і да апошняга дня ў шафе захоўвалася трацкісцкая літаратура.

ГОЛЬМАН.

УСПАМІНЫ АБ Ю. М. ПЭНЕ

Зверскае забойства вядомага мастака Ю. М. Пэна глыбока ўсхвалявала мяне. Разам з усімі працоўнымі Совецкай Беларусі я перажываю гэту цяжкую страту.

Я многае чула аб таленавітым мастаку, аб выдатным выяўленцу дарэволюцыйнага быту працоўных і яўрэйскай беднаты. І вось у 1932 годзе, будучы ў Віцебску, дзе я выступала ў канцэрце, я рашыла наведаць кватэру Ю. М. Пэна. Цэлы дзень правяла ў гэтай своеасаблівай карціннай галерэі, і агляд яе пакінуў на мяне незгладжальнае ўражанне.

Невялікая кватэра Ю. М. Пэна са столі да падлогі была ўвешана карцінамі. Вялікія палотны знаходзіліся і на кухні. Юрый Майсеевіч прыняў мяне спачатку з вялікім недавер'ем і асцярожнасцю. Яму здавалася, што я сваім візітам праследую якуюсьці непрыемную для яго мету. Але хутка лядок недавер'я растаяў, і ён ахвотна пазнаёміў мяне са сваімі планамі, надзеямі, творчымі замысламі і падрабязна растлумачыў змест карцін.

Нават беглы агляд карцін Пэна пераконвае, што яны напісаны кісцю буйнага мастака-рэаліста, які дае палотны вялікай сілы і значымасці, што карцінная галерэя Юрыя Майсеевіча — гэта каштоўная скарбніца мастацтва.

Яго карціны «Швец», «Развод», «Кравец», «Сват», «Карабейнік» — гэта сапраўдныя шэдэўры, дзе кожны штрых, кожны мазок кісці жыве, дзе са здзіўляючай тонкасцю, меткасцю і веданнем прадмета паказан быт старога дарэволюцыйнага яўрэйскага мястэчка. Вялікае ўражанне робіць карціны на новую тэматыку: «Юны шавец» і інш. У іх стары мастак перадаў сваю любоў да новага жыцця, да маладога шчаслівага пакалення.

Я зацікавілася жыццём Пэна. Ён расказаў мне, што мясцовыя арганізацыі клапяцца аб ім, што ён ні на што не скарджаўся. Ні адну са сваіх карцін ён не прадасць. Усю карцінную галерэю ён перадасць у дар народам Совецкай Беларусі.

Прыехаўшы ў Менск, я наведала Наркомасветы. Паставіла там пытанне аб дапамозе і больш чулых адносінах да мастака. Начальнікам Галоўмастацтва быў у той час трацкіст Дунец. Ён мне адказаў наступнае:

— Мы Пэна ведаем. Гэта не наш мастак. Ён устараў. Яго рэалізм і апісанні старога быту нам непатрэбны. І наогул ён робіць ураджанне антысовецкага чалавека (?!)...

Мяне вельмі абурыла і здзівіла гэта заява. Але я нічога не магла зрабіць — са мной гаварыў кіраўнік мастацкай справы ў Беларусі.

Цяпер я разумею сэнс заявы Дунца. Звычайная тактыка трацкістаў — за «дзевай» фразай хаваць брудную шкодніцкую справу: адштурхнуць ад совецкай улады вялікага мастака, пазбавіць народ магчымасці скарыстаць вялікую спадчыну мінулага.

У 1936 годзе, пабываўшы у Віцебску, я зноў наведала Ю. М. Пэна. Мастак прыкметна пастарэў, але, пазнаўшы мяне, зноў доўга гутарыў, дзяліўся сваімі марамі і замысламі. Як і раней юны пыл, агонь творчай маладоспі гарэў у яго вачах, калі ён гаварыў аб сваіх планах. У прыватнасці і расказаў, што абіраецца скончыць вялікую карціну аб Леніне.

Але рука подлага забойцы перапынала старому ў канцы свайго жыцця напісаць вялікае палатно на рэволюцыйную тэматыку.

САРА ФІБІХ —
Артыстка МАСКОЎСКАЙ ДЗЯРЖАЎНАЙ ФІЛАРМОНІІ.

ДАКУМЕНТ, ЯКІ НЕ АДБІВАЕ САПРАЎДНАСЦІ

Прэзідыум менскага горсавета «ашчаслівіў» дэпутатаў і ўсіх выбаршчыкаў выданнем спецыяльнага «Бюлетэня аб выкананні менскім гарадскім советам Рабочае-Сялянскіх і Чырвоناармейскіх Дэпутатаў XIV склікання наказу і дадатку да наказу». Бюлетэнь быў выпушчан яшчэ ў другой палове 1936 года і з таго часу кожны раз падносіцца дэпутатам горсавета на пленумах. Раздалі яго і ўсім удзельнікам праходзячага зараз пленума горсавета.

Слоў няма, сістэматычная справаздача перад выбаршчыкамі аб выкананні наказу —справа вельмі важная і неабходная. Гэта, уласна кажучы, прамы абавязак горсавета. Але само сабою зразумела, што справаздачы павінны быць чэснымі, праўдзівымі і самакрытычнымі. На жаль, гэтага нельга сказаць аб бюлетэні. Калі судзіць па ім, выходзіць, што абсалютна ўсе пункты наказу горсоветам або ўжо выкананы, або акуратна выконваюцца. Невыкананых пунктаў у ім няма ні аднаго.

Астаецца здзіўляцца: за што-ж тады на ўсіх сходах выбаршчыкаў крытыкуюць горсовет, чаму ўсюды яго папракаюць у невыкананні наказу?

Аказваецца «ларчык проста адчыняецца»: невыкананыя пункты горсовет проста знайшоў за лепшае, не ўключаць у бюлетэнь. Так спакайней, навошта напамінаць аб іх выбаршчыку ці нават дэпутату.

Але звернемся да пунктаў наказу, якія прэзідыум горсовета лічыць выкананымі. У аддзеле «гарадская гаспадарка», напрыклад, ёсць такі пункт: «Раку Свіслач прывесці ў належны выгляд, пагльбіць і ачысціць ад бруду».

Адзнака прэзідыума горсовета: «Па рэканструкцыі і ўпарадкаванню ракі Свіслач распрацован і зацверджан дэтальны праект на суму 7.500 тысяч рублёў. Пачатак работы запланіраван у 1937 годзе».

Ці адпавядае гэта сапраўднасці? Не, не адпавядае. Зусім нялаўна (4—5 красавіка), на пасяджэнні СНК БССР было заслухана паведамленне тав. Жуковіча аб рэгуляванні ракі Свіслач. Выявілася, што горсовет недапушчальна запягнуў гэту справу. Ён прадставіў толькі частку праекта і сметы, якія прадугледжваюць будаўніцтва водахавальніка ва ўрочышчы «Гопалес», у той час як пастанова СНК БССР ад 24 ліпеня 1934 г. уключае таксама праект рэгулявання ракі і ў межах горада.

Або вось другі пункт у тым-жа аддзеле: «Пабудаваць у 1935 г. культурную лазню і правесці дасканалы рамонт усіх існуючых лазняў, палепшыўшы іх санітарныя ўмовы і абслугоўванне імі насельніцтва».

Адзнака прэзідыума горсовета: «Новая культурная лазня будуецца і ў 1937 г. будзе здана ў эксплаатацыю; у чатырох існуючых лазнях зроблен рамонт і пераабсталяванне».

Не будзем ужо гаварыць аб парушэнні тэрміна пабудовы лазні (запяжка яўна недапушчальная!) Але аб чатырох існуючых лазнях трэба безумоўна пагаварыць. Па бюлетэню выходзіць, што тут ўсё ў парадку: рамонт і пераабсталяванне зроблены, чаго-ж яшчэ? Але які рамонт, якое пераабсталяванне?—аб гэтым няма ні слова. Варта толькі зайсці ў любую з чатырох лазняў, як адразу кінецца ў вочы бруд, антысанітарыя, чаргі, мітусня. Колькі зусім правільных скарг насельніцтва на дрэнную работу лазняў! На самым пленуме, у спрэчках па дакладу тав. Жуковіча, дэпутаты нямала гаварыць аб гэтым нахваляўшым пытанні (прамовы тт. Ліўшыц, Шыфрыной і інш.). Ці не ясна, што сцвярджанні аб выкананні гэтага пункта наказу даволі сумніцельныя.

У такім-жа самасупакойваючым аптымістычным духу, складзен і ўвесь бюлетэнь.

Кіраўнікі горсовета лішні раз паказалі не толькі сваю бюракратычную самазадаволенасць і бесклапотнасць, але і прамую безадказнасць і нагардлівыя адносіны да мас выбаршчыкаў.

Е. С.
С. Г.

ЗЛАЧЫНСТВЫ НА КАМБІНАЦЕ „КОМІНТЭРН"

Упаўнаважаным Камісіі Партыйнага Кантроля пры ЦК ВКП(б) па БССР было праведзена абследаванне гаспадарчай і фінансавай дзейнасці барысаўскага дрэваапрацоўчага камбіната «Комінтэрн». Абследваннем выкрыты злоўжыванні, раскрадванні і бытавое разлажэнне ў кіруючым складзе гэтага прадпрыемства.

У 1935 годзе на пасаду дырэктара камбіната быў прыслан член партыі Буценка Пётр Васільевіч, які потым аказаўся аферыстам. Буценка акружыў сябе цёплай кампаніяй лоўкіх дзяльцоў, якія ператварылі сацыялістычнае прадпрыемства ў ачаг злоўжыванняў.

Першым памочнікам Буценка з'явіўся галоўны бухгалтар камбіната Выгоцкі, чалавек, які беспярэмонна залязае ў дзяржаўную кішэню. Буценка перадаверыў яму кіраўніцтва фінансавай дзейнасцю, зрабіўшы яго распарадчыкам крэдытаў. Пры такім парадку лягчэй было рабіць злоўжыванні і за іх не адказваць. Так, Буценка атрымаў пад справаздачу 26.000 р. і адчытваўся за іх зусім неаформленымі дакументамі. Выгоцкі таксама не даваў сябе ў крыўду. Маючы ўласны дом, ён атрымлівае ад дзяржавы «кватэрныя». Апрача таго, за кошт прадпрыемства плаціў за ралыё, за страхаванне ўласнага дома і т. д. Усяго на такія мэты ім было атрымана з дзяржаўнай касы 5.000 руб. Выгоцкі забраў да сябе на кватэру таксама поўны камплект заводскай мэблі, у тым ліку піяніна і патэфон.

Пад кіраўніцтвам Буценка і Выгоцкага транжырыліся сродкі направа і налева. Карысталіся дармовымі кватэрнымі і камунальнымі паслугамі 19 работнікаў камбіната. Даходзіла да таго, што рахункі на колку дроў, на пакупку папірос адказа. У рэзультаце па адных адміністрацыйнага кіраўнічых расходах ёсць перавылдатканне на 43.000 руб. Апрача таго, з работнікаў камбіната спісвалася запазычанасць без усякіх на гэта падстаў. Наладжванне вечароў толькі за поўгода было растрачана 2 тысячы рублёў.

На камбінаце быў шырока распаўсюджан незаконны тавараабмен. Разбазарваліся дэфіцытныя матэрыялы.

Для большай зручнасці злоўжываць арганізоўваецца незаконнае прадстаўніцтва ў Харкаве і Маскве. На пасаду агента-прадстаўніка Буценка прыняў старога знаёмага Павіна Васіля, які незаконна прысвоіў сабе 4.000 рублёў.

У сваёй справаздачы на 7.000 руб., якія былі атрыманы ад Барысаўскага горсовета, Буценка ўключыў на ўсю суму фіктыўныя дакументы, складзеныя ім на розны манер пры дапамозе сваіх паслужлівых падначаленых Выгоцкага і тэхніка будаўніцтва Ржэўскага.

Як устаноўлена следствам, Буценка прысвоіў сабе 10.000 рублёў.

Ва ўсіх агіднасцях, якія рабіліся на камбінаце, прымалі ўдзел сакратар парткома Ферага і старшыня заўкома Вербіцкі. Абодва яны з Буценкам былі звязаны сістэматычнымі п'янкамі і злоўжываннямі.

П'янкі праніклі і ў кіраўніцтва асобных цэхаў. Старшы электрамацёр камбіната Валодчанка сістэматычна з'яўляўся на работу ў п'яным выглядзе, у выніку чаго на камбінаце мелі месца аварыі і прастойвалі цэхі. Той-жа Валодчанка тэрарызаваў работніц камбіната і прымушаў іх да сужыцця.

Узнікае пытанне як магла гэта кампанія разлажыўшыхся людзей так доўга арудаваць на адным з буйнейшых прадпрыемстваў нашай рэспублікі, як мог расквітнець пышны букет агіднасцей і злоўжыванняў на вачах раённых арганізацый.

Гэта здарылася з-за бестурботнасці работнікаў Барысаўскага РК КП(б)Б, за якіх неаднаразова даходзілі сігналы аб тым, што на камбінаце не ўсё добра. Райком партыі не знайшоў патрэбным бліжэй прыглядзецца да вочкаўціраделя і пераканаўшыся Буценка і не мог разгледзець, што за сухімі лічбамі аб выкананні прамфінплана крыецца крымінальшчына. Работнікі райкома толькі ўдзельнічалі на ўрачыстых вечарах замест дзелавога кіраўніцтва камбінатам.

Вінаватыя ў злачынствах на барысаўскім камбінаце «Комінтэрн» прадсталі перад Вярхоўным судом рэспублікі.

РОШЧЫН.
ДАЙЧЫК.

ЗАБЯСПЕЧЫМ ВЫСОКІ ЎРАДЖАЙ КАНЮШЫНЫ

Укараненне канюшыны ў севазвароты — адна з важнейшых умоў павышэння ўраджайнасці зернавых і ільну і стварэння ўстойлівай кармовай базы ў калгасах і соўгасах.

Канюшына, як і ўсе шматгадовыя травы, добра палепшае і структуру глебы і яе аэрацыю. Канюшына з'яўляецца лепшым папярэднікам для ўсякіх культур, а асабліва добра па канюшынішчы расце лён.

Канюшына, у параўнанні з іншымі культурамі, лічыцца менш патрабавальнай расінай у адносінах утрымання азота ў глебе. Аднак і канюшына валодае некаторымі спецыфічнымі ўласцівасцямі і патрабаваннямі да глебы, якія трэба ведаць і забяспечыць, каб атрымаць не проста канюшынішча, а самыя высокія і ўстойлівыя ўраджаі.

На БССР на больш связных глебах добра расце чырвоная канюшына двухгадовага карыстання (разбей — трохгадовага або аднагадовага карыстання). Але чырвоная канюшына, даючы лепшую і багатую масу, месцамі, а ў некаторыя гады на заметных плошчах можа папасці ў небяспеку вымярзання і вымачак.

Каб перасцярагчы канюшыну ад вымярзання, нельга яе скошваць ніжэй 3—5 сантыметраў ад зямлі. На адхонах і ўзгоркаватых месцах, дзе зімою снег зносіцца ветрам, неабходна паклапаціцца аб снегазатрымранні.

Вымачкі канюшыны звычайна бываюць у нізкіх месцах або па лунках і западзінах сярод роўных палёў, дзе застойваецца вада. У такіх выпадках неабходна загадзя пракапаць сточныя барозны, або, дзе гэтага нельга зрабіць, правесці грабіністае ворыва. На палях сырых або з позадзглым сезонным забалочваннем трэба сеяць шведскую канюшыну, як больш устойлівую ад вымачак.

На моцна кіслых глебах канюшына развіваецца дрэнна. Такое поле ў першую чаргу неабходна вапнаваць. Як агульная норма рэкамендуецца для сугліністай глебы — 4—6 тон вапны на гектар, для лёгкіх — 2—3 тоны на гектар.

Канюшына мае моцную і глыбокую карнявую сістэму; таму пад пасевы канюшыны (пад пакроўныя зернавыя культуры) трэба праводзіць глыбокае зяблевае ворыва не менш 16—18 і 20 сант. (лічачыся з папярэняй глыбінёй ворыва). Канюшына, як шырока-лісцевая расліна, спажывае і выпарае многа вільгаці і алсюль, зразумела, лепш расце на больш связных глебах (суглінках), якія маюць больш вільгаці.

На вельмі лёгкіх глебах (пясках) канюшына мае недахват вільгаці, асабліва ў засушлівыя гады. І тут канюшына з вялікім поспехам замяняецца сарадэлай або лубінам на зялёнае ўгнаенне.

Аднак такая лёгкая глеба, як звязныя пяскі або супесі, асабліва калі яны блізка падсцілаюцца суглінкамі, таксама могуць быць ператвораны ў добрую зямлю для канюшыны. Трэба толькі паклапаціцца, каб на працягу некалькіх гадоў гэтая зямля ў дастатковай колькасці запраўлялася арганічнымі ўгнаеннямі.

Найлепшым месцам для сяўбы канюшыны з'яўляецца поле азімага і яравога кліну, пад якое ўносяцца арганічныя і мінеральныя ўгнаенні пад пакроўныя культуры. Для запраўкі глебы пад зернавыя з падсевам канюшыны, апрача гною, неабходна шырока скарыстаць торф у выглядзе торфагноевай сумесі, торфагноевы кампост.

На глебах, якія патрабуюць вапнавання, унясенне арганічных угнаенняў неабходна спалучаць з вапнаваннем, выкарыстаўшы для гэтага вапнавыя туфы і іншыя мясцовыя вапнавыя пароды. Адначасова з арганічнымі ўгнаеннямі пад зернавыя з падсевам канюшыны неабходна ўносіць калійна-фасфатныя ўгнаенні.

З фосфарных угнаенняў асабліва ўвагу заслугоўвае фасфарытная мука, якую пад пакроўныя культуры неабходна ўжываць у павышаных дозах, прыкладна, каля адной тоны на гектар.

Пры вапнаванні пад пакроўныя культуры замест фасфарытнай мукі лепш прымяняць суперфасфат у колькасці 3—4 цнт. на гектар. Дослеламі Горадкай сельскагаспадарчай станцыі ўстаноўлена, што пры ўнясенні 18—36 тон гною на суглінках атрыман ураджай сена першага ўкосу канюшыны 48—79 цэнтнераў; у той час, як на няўгноеных плошчах атрыман ураджай 20—26 цнт. сена з гектара. У калгасах Лёзнянскага раёна ў 1936 годзе 20 тон гною разам з 20 тонамі нізіннага торфу аказалі такі-ж уплыў на ўраджай канюшыны, як і 40 тон гною.

Ад лубіну, пад які ўнесена 8 цэнтнераў фасфарытнай мукі і 4 цэнтнеры сільвініта, а таксама ад нізіннага торфу, прапушчанага праз скотны двор, ураджай канюшыннага сена з аднаго ўкосу першага года карыстання атрыман 72—81 цэнтнер з гектара.

Сяўба і падкормка канюшыны. Насенне канюшыны павінна быць нармальнай усхожасці і не павінна мець прымесяў сарнякоў траў, асабліва кускуты. Аб якасці насення канюшыны часткова можна меркаваць па афарбоўцы яго. Насенне чырвонай канюшыны мае фіялетавую, жоўтую і бурую афарбоўку. Лепшымі пасеўнымі якасцямі валодае фіялетавае насенне. Жоўтае насенне таксама можна лічыць каштоўным, а бурая афарбоўка насення сведчыць аб няправільнай уборцы і ненармальным хаванні насення. У пасеўным матэрыяле канюшыны павінна быць вызначана ўсхожасць і засмечанасць насення.

Канюшына падсейваецца пад азімыя або яравыя зернавыя.

У мэтах роўнамернага падсеву і павелічэння продукцыйнасці працы канюшыну трэба падсяваць сеялкай.

Канюшына таксама падсейваецца і пад зернавыя яравыя — ячмень, пшаніцу і радзей пад авёс. У такіх выпадках канюшына падсейваецца адразу пасля сяўбы яравых зернавых упоперак ралавой сяўбы зернавых. Пасля падсейвання канюшыны пад яравыя зернавыя, у выпадку раскідной сяўбы, неабходна зрабіць прыкатванне глебы або задзелку насення лёгкай бараной ці валакутай.

Ураджай канюшыны можна павялічыць больш чым на 50 проц. шляхам падкормкі не ранняй вясною суперфасфатам, калійнай соллю або сільвінітам, ці поплам.

У якасці ранняй веснавой падкормкі неабходна ўнесці 3—4 цэнтнеры суперфасфату разам з 1,5—2 цэнтнерамі калійнай солі або 3—4 цнт. сільвініту на адзін гектар.

Угнаенні ў якасці падкормкі неабходна ўносіць рана вясною яшчэ да пачатку росту канюшыны і пасля ўнясення заделаць бараною.

Пры выбары канюшыны на насенне са звычайных пасеваў, неабходна вылучаць участкі з лепшым і роўным травастоем канюшыны, а пры змешаным пасеве такія, дзе канюшына мае перавагу над цімафейкай. Апрача таго, участкі насенной канюшыны не павінны быць засмечаны прымесямі, асабліва павілікай.

Для насенных участкаў неабходна пакідаць канюшыну першага ўкосу. Пры ўмове вельмі добрага развіцця канюшыны і пакідання на насенне другога ўкосу, уборку першага ўкосу канюшыны на сена трэба правесці раней звычайных тэрмінаў да пачатку цвіцення. Участкі з наглым травастоем пакідаць на насенне нельга.

Я. АФАНАСЬЕЎ.
І. ВЛАСЕНКА.
Інстытут аграглебазнаўства Акадэміі Навук БССР.

ХАТУ-ЧЫТАЛЬНЮ ЗРАБІЦЬ КУЛЬТУРНЫМ АЧАГОМ КАЛГАСНАЙ ВЁСКІ

Сёння мы друкуем матэрыялы аб выкананні рашэння бюро ЦК КП(б)Б аб культурна-асветнай рабоце на вёсцы. Трэба прама сказаць, што гэта рашэнне не выканана не толькі многімі раённымі арганізацыямі, але нават і некаторымі цэнтральнымі. Факт-жа, што Саўнарком БССР за год не знайшоў часу, каб разгледзець пытанне аб паляпшэнні матэрыяльных умоў работнікаў культурна-асветных устаноў, а Наркомасветы злачынна зрывае справу падрыхтоўкі кадраў і наогул не піруе культасветработай у вёсцы.

А ў рэспубліцы ёсць усе ўмовы для правядзення належнай культурна-асветнай работы. У БССР налічваецца 1.422 хаты-чытальні, 90 дамоў соцкультуры, 915 калгасных клубаў. Усе гэтыя цэнтры выхавання совецкага сялянства не заўсёды скарыстоўваюцца, як патрэбна, а вельмі часты выпадкі, што яны зусім не працуюць. Прычым, сярод культасветработнікаў больш 70 проц. членаў партыі і комсамольцаў — гэта таксама сур'ёзная ўмова добрай пастаноўкі культасветработы на вёсцы.

Неабходна ў бліжэйшы час праверыць, як выкананы рашэнне бюро ЦК КП(б)Б ад 9 сакавіка 1936 года аб культурна-асветнай рабоце на вёсцы.

БЕЗ КІРАЎНІЦТВА І ДАПАМОГІ

Вечарам на вуліцы вёскі Чэрнаўка збіраюцца людзі. Яны стаяць групамі і вядуць размовы аб вясне, аб вайне ў Іспаніі, аб усім пакрысе.

Калі зусім сцямнее — многія ідуць у піўную, якая стаіць тут-жа насупроць сельскага совета. Там светла гарыць лямпа, цёпла і можна пасядзець на лаўках, так-сяк правесці вечар.

За піўной віднеецца сельсоветская хата-чытальня. У вокнах цёмна, мабыць нікога няма. Дый ніхто туды не ідзе.

У хаце-чытальні холадна, сыра і брудна. Бутылкі вялікі, апальваюць яго рэдка. Печкі няспраўныя. Летам сельсовету патрабаваліся для свайго памяшкання вошкі і дзверы. Старшыня выняў іх з печак хаты-чытальні.

Прыбіральшчыца скарэліца:

— З мінулага лета не мылі падлогу. Замярзае вада ад холаду.

Ад сырасці сцены сталі ў плямах, у адліку выступае вада. На сцэнах — пажаўцелыя плакаты і лозунгі. Вінкі з дзеразы высахлі і асыпаліся.

Паспех скалочаная сцэна завалена смеццем. Пуста і няўтульна.

— Якія выпісваюцца газеты? — пытаемся ў хатніцы Цылі Сандлер.

Яна павздамляе, што выпісаны 4—5 экземпляраў. «Правды» і «Известий» па ліміту не напала для чытальні. Журналаў няма. Шафа пустая — ні аднаго мастацкага твору.

Цыля Сандлер працуе хатніцай ужо другі год. За ўвесь час яна не бачыла ў сваёй хаце-чытальні больш 6—7 чалавек. Калі нават прыязджае кіно-перасоўка, у хату-чытальню прыходзіць вельмі мала людзей. Хата-чытальня мае патэфон, але Сандлер не адважваецца пакідаць яго тут і трымае ў сябе на кватэры.

Для рамонту ў 1936 годзе былі адпушчаны сродкі ў суме 3 тыс. рублёў. Аднак, з добрай волі намесніка старшыні сельсовета Кірэенкі грошы на рамонт не скарыстаны.

Зразумела, чаму ў чэрнаўскую хату-чытальню не ідуць калгаснікі. Тут няма чаго рабіць. Бывае, што калі-небудзь моладзь папросіць хатніцу дазволіць ім патанцаваць, і яна/гэтым задаволена.

Калгасная моладзь і пажылыя часамі праводзяць вечары за картамі, у піўной і т. д. Нярэдка сярод іх дзейнічаюць розныя рэлігійныя групы, якіх у Чэрнаўцы даволі многа. Там, дзе не працуе хата-чытальня, працуюць агенты папа.

На самой справе, у Дрыбінскім раёне работа рэлігійнага культа праводзіцца шырэй, чым масавая работа ў хатах-чытальнях. Напрыклад, у Рабцаўскім сельсавеце чытальня заўсёды пад замком, а поп гэта скарыстоўвае для сваіх мэт.

З існуючых 18 хат-чытальняў працуюць толькі адзінкі. Пад замком хаты-чытальні ў Гаспадоўскім, Яганаўскім і многіх іншых сельсоветах. У калгасе «Чырвоны сад» хата-чытальня ператворана ў памяшканне для ігракоў у карты. Заяллымі карцёжнікамі з'яўляюцца старшыня калгаса Паўлаў, брыгадзір Тарасенка і старшыня рэўкамісіі Піпічкін. Моладзь яны выганяюць з чытальні.

У чым прычына дрэннай работы хат-чытальняў? Асноўная прычына ў дрэнным падборы хатнікаў. На паперы лічыцца, што хаты-чытальні ўкамплектаваны. А хто гэтыя хатнікі? У большасці непадрыхтаваныя людзі, з нізкай адукацыяй.

Раённы аддзел асветы не дапамагае хатнікам у рабоце. Палітінспектар раёна т. Ханін не ведае, што робяць хатнікі, ні працуюць яны пад сабой. Хатнікі прадастаўлены самі сабе.

— Што мы будзем рабіць, калі нам з Наркомасветы таксама не аказваюць ніякай дапамогі ў рабоце, — заўважаюць работнікі раённага аддзела асветы.

І сапраўды, ні Наркомасветы БССР, ні райана не звяртаюць увагі на сельскія хаты-чытальні. Вось чаму ў Дрыбінскім раёне хаты-чытальні не сталі цэнтрам палітычнай і культурна-масавай работы на вёсцы.

А. ЛОСЬ.

ЗАМЕСТ ЧЫТАЛЬНІ—СКЛАД

У калгасе імя Варашылава, Веткаўскага раёна, ёсць аддаленне Вярхуліпча. Гэта—вялікае паселішча з 300 гаспадарак. Не раз калгаснікі з Вярхуліпча прасілі старшыню калгаса Снежкова адкрыць хату-чытальню. Для яе ёсць падыходзячае памяшканне, выпісваюцца паміма старшыні калгаса газеты, набыта невялікая колькасць літаратуры. Але Снежкоў не зварачае ўвагі на просьбы калгаснікаў:

— Бачыце, — кажа ён, — у гэтым памяшканні ляжыць 10 пудоў вікі...

— Віку можна перавезці ў пустую клець, — прапануюць калгаснікі.

— Не ваша справа, — коратка адказвае старшыня: — я гаспадар...

Для старшыні калгаса культурна-масавая работа — пабочная справа. У калгасе няма насценгазеты, не праводзяцца сходы. Гэта зразумела: Снежкоў баіцца крытыкі, бо з'яўляецца свядомым натуральнікам распяцвання калгаснага дабра і інш. злоўжываннаў.

Аб гэтым нецярпімым становішчы мы не раз пісалі ў раённую газету і райком партыі, але дагэтуль мер ніякіх не прынята.

М. БАРСУКОЎ, А. КАМІСАРАЎ.

ВЕЧАРАМ НЯМА КУДЫ ПАЙСЦІ

Няма куды пайсці вечарам моладзі мястэчка Пухавічы. Як ні дзіўна, але дагэтуль месцам збору служыць піўная. У лепшым выпадку, калі спрыяе надвор'е, моладзь без справы тулаецца па вуліцах.

А між тым, у мястэчку ёсць усе ўмовы для разгортвання культурна-масавай работы. Ёсць дзве хаты-чытальні — адна агульнаместачковая, другая — адкрытая швейнай і кравецкай арцелямі. Абедзве хаты-чытальні нядрэнна абсталяваны, набыты кнігі для бібліятэк, більярды, даміно, шахматы, выпісваюцца газеты.

Але загадчыкі хат-чыталенъ Баско Шэпсель і Дуброўскі зрываюць работу. Рэдка знімаюцца замкі з дзвярэй хат-чыталенъ, а калі часам і бываюць адкрыты, то ўсёроўна пустуюць, бо газеты загадчыкамі занесены дамоў, а гульні замкнуты. Затрачаны буйныя сродкі на абсталяванне чыталенъ і на ўтрыманне загадчыкаў, а карысці ніякай няма.

І гэта адбываецца ў раённым цэнтры, на вачах райана і райкома комсамола.

Ж-к.

КАЛІ НАДЫЙДЗЕ ВЕЧАР

Гусцее вячэрні змрок. З усіх участкаў прасторнага поля, раскінутага на многа кілометраў, з'язджаюцца на калгасны двор работнікі паляводчых брыгад. Працоўны дзень скончан. Старыя, пажылыя калгаснікі і калгаснікі, хутка ўпарадкаваўшы коней і інвентар, накіроўваюцца адпачываць. Моладзь-жа не адчувае стомленасці—яшчэ можна было-б гадзіну-дзве не ісці спаць. Але чым заняцца і дзе?

З цэнтра калгаса даносяцца галасы гармоніка. Некалькі дзяўчат, ідучы з калгаснага двара, астанавіліся і прыслухоўваюцца.

— Вечарынка?—здзіўлена запытвае адна.

— Напэўна...

— Бяжым, дзяўчаткі, пераапранаецца...

У невялікім памяшканні, якое пабудавана для дзіцячых яслей, але пакуль што скарыстоўваецца як хата-чытальня, камсамольцы сабралі сход, пачыталі даклад таварыша Сталіна, пагаварылі і потым на гадзіну наладзілі гульні і танцы. Падыйшло шмат моладзі. Камсорг Данілаў і загадчык хаты-чытальні комсамолец Старавойтаў заставоены: хоць раз сабралі моладзь і пачыталі, і павесяліліся. Моладзь была таксама задаволена. Ішлі па вуліцы дружнай гурбой, іграў гармонік, гучалі песні над прыціхшымі будынкамі.

Але такія вечары — рэдкі выпадак. Звычайна-ж, прыехаўшы з поля веснавым вечарам, групы моладзі пройдуць па вуліцы, перакінуцца жартамі, паспяваюць і разыйдуцца па хатах. Сабрацца няма дзе.

Як не дзіўна, а адзін з перадавых на ўвесь раён, вялікі па колькасці гаспадарак, заможны калгас «XVII партз'езд» не мае клуба. Ёсць загадчык хаты-чытальні як штатная адзінка — ініцыятыўны жывы комсамолец. Ёсць маленькая бібліятэка, більярд, шахматы, шашкі. Памяшкання-ж для хаты-чытальні няма. Праз тыдзень адчыняюцца дзіцячыя яслі, і Старавойтава з усім абсталяваннем хаты-чытальні высяляць з памяшкання. Побач пустуе памяшканне старой школы. Раённы аддзел нарасветы дазволіў часова заняць тут два пакоі, але дырэктар НСШ Ахрамовіч катэгарычна засупярэчыў:

— Не пушчу! Увосень школа пашыраецца і гэта памяшканне спатрэбіцца...

— Нам-бы хоць на адзін месяц, — упрашвалі комсамольцы.

— Не пушчу, і ўсё!—заключыў размову Ахрамовіч.

Так і асталася да вясны хата-чытальня, прадугледжаная раённым аддзелам асветы, адзіная на цэлы Збароўскі сельсавет, без памяшкання. Прыязджаў не раз палітінспектар Кац, глядзеў, здзіўляўся, ківаў галавой і ад'язджаў. Як відаць, для аддзела асветы важна, каб лічыўся на паперы хатнік, а становішча хаты-чытальні, яе работа, асабліва на веснавой сяўбе — справа, якой можна і не цікавіцца.

У палявых брыгадах працуе шмат моладзі. Яе культурныя патрабаванні выраслі. Але яны не задавальняюцца. У бібліятэцы Старавойтава зусім мала кніг, ды і тыя старыя. Газет на хату-чытальню зусім не выпісваецца: аддзел асветы не адпусціў грошай. Брыгады таксама газетамі не забяспечаны. Ні палітгурагак, ні чыткі газет, ні другіх форм культмасавай работы на полі не праводзяць.

Таму і з'яўляецца для моладзі вялікай радасцю звычайная вечарынка, якая збіраецца пад выходны дзень, або проста пасля работы. І тым лепш, калі на гэтай вечарынцы хто-небудзь з комсамольцаў пачытае ўголас газету, або арганізуе пытанні і адказы на самыя рознастайныя тэмы.

Мы ўзялі адзін з буйных і перадавых калгасаў Рагачоўскага раёна. Культурная работа на час веснавой сяўбы тут не наладжана. З гэтым, відавочна, мірацца раённы аддзел асветы, райком комсамола і іншыя раённыя арганізацыі.

Тар. ХАДКЕВІЧ.

СУМНАЯ САПРАЎДНАСЦЬ

На 99 калгасаў у Асіпавіцкім раёне больш-менш стала працуюць усяго 9 хат-чытальняў. Аднак, пяжка сказаць, штожольвечы станоўчае пра работу іх. Пра работу хат-чытальняў не ведаюць не толькі ў райана, але і ў райкома партыі.

У зверайцоўскай хаце-чытальні «працуе» выключаны з партыі п'яніца Шапляк, які абсалютна некультурны і непісьменны. Шапляк нават сам не чытае газет, якія да яго дадому прыносіць пісьманосец. У хаце-чытальні ён ніколі не бывае, затое на кожнага аднаасобніка ён склаў ужо па некалькі актаў за невыкананне плацяжоў...

750 руб. адпусціў РВК на абсталяванне замоскай хаты-чытальні. Але працы ў ёй няма. Справа зноў у людзях. Хатнік Казючыц, раней дрэнна працаваўшы сакратаром сельсовета, рахункаводам і на чыгунцы, зараз прыгрэўся ў чытальні і нічога не робіць. Райана мала ніхавіць той факт, хто будзе працаваць хатнікам. З 9 хатнікаў 6 чалавек маюць асвету за 3—4 класы і зразумела якую культасветную працу яны могуць весці. Не гледзячы на такое становішча, ні РК КП(б)Б, ні РВК не паклапаціліся, каб правесці курсы па перападрыхтоўцы хатнікаў. Другі сакратар РК КП(б)Б тав. Краскоў пытанне кадраў для хат-чытальняў вырашыў зусім проста: даручыў райкому комсамола вызначыць комсамольцаў для работы на гэтым участку. Але карысці з гэтага «мерапрыемства» ніякай.

Зусім відавочна, што там, дзе не працуюць хаты-чытальні, там працуе вораг. Вядом-жа факт кіраўніцтву асіпавіцкага раёна, што ў калгасе імя Калініна хата-чытальня разбурана (павыбіты вокны, паломаны крэслы і інш. мэбля). Знішчыўшы чытальню, ворагі падбухторваюць калгаснікаў адкрыць царкву. У раёне факт разбурэння аты-чытальні лічаць проста «хуліганствам напіўшыхся рабят».

Старшыня калгаса «Будаўнік», Пігулеўскі адмовіў механіку дэманстраваць у калгасе кінофільм «Чапаеў», і калгаснікі вымушаны былі ісці глядзець гераічны фільм у суседні калгас «Пролетарый». У раёне па гэтаму выпадку апрача райгазеты ніхто і пагаварыць не падумаў. У калгасе «Дуброва» за ўсю зіму ніводнага кіносеанса не было, у калгасе «Чырвоная ніва» нават не адведзена месца, дзе можна было-б хоць газету прачытаць. Толькі-што пабудаваную хату-чытальню ў калгасе імя Энгельса праўленцы ператварылі ў краму(!). Раённыя-ж кіраўнікі гаворадь, што ў сельсоветах, у якія ўваходзяць гэтыя калгасы, «добра пастаўлена культасветная работа».

Людзі, якія працуюць у раёне і непасрэдна павінны кіраваць і самі правозіць культасветную працу, нічога не робяць. Палітасветінспектар райана Стрыго працуе ў раёне другі год. Мы спыталі ў яго:

— Колькі вы наведалі хат-чытальняў?

— Усе, — адказвае ён.

— Што вы ў іх рабілі?

— Абследванне рабіў.

— А потым?

— Потым прыязджаў у раён, перадрукоўваў вывады і падпісваў.

— І ўсё?

— І ўсё, — без малейшага сумнення адказвае Стрыго. Ні адной чыткі, ні адной гутаркі Стрыго ў калгасах не правёў. Ні адной насценгазеты выпусціць не дапамог. Ні адной бібліятэчкі ў калгасах не ўкамплектаваў. І гэта называецца палітасветінспектар!? Не далёк ад яго і загадчык райана т. Сіротка. Непасрэдна адказваючы за пастаноўку культработы ў раёне, ён гэту важнейшую справу пусціў на самацёк, даверыў пабочным людзям. Тыя поспехі, якія там-сям ёсць, ні ў якім разе не з'яўляюцца заслугай раённых кіраўнікоў, якія нават не падтрымалі ініцыятыву перадавікоў і ні адной алімпіяды калгаснай самадзейнасці не правялі.

Характэрныя дэталі работы Наркомасветы раскрываюцца ў Асіпавічах. 14 снежня 1936 года сюды прыязджаў прадстаўнік НКА Чахоўскі. Ён зрабіў усё тое, што падабае гогалеўскаму рэвізору. Склаў вялікія вывады, перадрукаваў іх і... паехаў. Роўна праз месяц—14 студзеня 1937 г. у раён прыязджае другі прадстаўнік НКА Слесарэнка. Гэты таксама праявіў сябе. За 5 дзён ён паспеў перапісаць «вывады» Чахоўскага, яшчэ раз перадрукаваць іх, змяніць даты, падпісаць і... паехаць. А належных большэвіцкіх, партыйных вывадаў па рабоце райана і іншых арганізацый ні першы, ні другі не зрабілі. Гэта, відаць, «не ўваходзіць у функцыі» работнікаў Наркомасветы!?

П. КАВАЛЁЎ.

ЗМЯНІЛАСЯ Ъ ЗАГАДЧЫКАЎ

Пры Пагоскім сельсавеце Бярэзінскага раёна ўжо некалькі год існуе Дом соцыялістычнай культуры. За 1936 год у ім змяніліся 5 загадчыкаў. З 1 кастрычніка 1936 года загадчыкам працуе жонка старшыні сельсовета Маланья Семашка. За ўвесь час яе работы ДСК ні разу не быў адкрыты. Усё абсталяванне дома — радыёпрыёмнік, сталы, бібліятэка пакрыты пылам і павуцінням, не гледзячы на тое, што сельсавет кожны месяц выплачвае 25 руб. уборшчыцы ДСК. Выпісваемыя на ДСК газеты і журналы Семашка трымае ў сябе на кватэры.

Мястэчка Пагост налічвае больш 300 двароў. Побач — МТС, непоўная сярэдняя школа, паштовае аддзяленне, шмат культурных сіл. І тымчасам моладзь вечарамі не мае прытулку.

Зусім зразумела, калі калгаснікі абураюцца: грошы трацяцца бескарысна, і ніхто з адказных работнікаў сельсовета і раёна на гэта не зварачае ўвагі.

М. КАЗАКЕВІЧ, І. МАРКОЎСКІ, М. ЖУКОЎСКІ.

У НЕКАЛЬКІ РАДКОЎ

◎ У цэнтры Крупецкага сельсовета — вёсцы Крупец, Добрушскага раёна, ёсць клуб з абсталяванай хатай-чытальняй са сцэнай, з вялікай залай, з бібліятэчкай. Але загадчык клуба Мельнікаў бяздзейнічае, клуб ніколі не адкрываецца. Вялікая вёска астаецца без культурнага абслугоўвання.

В. БЕРДНІКАЎ.

◎ Больш 200 чалавек моладзі ў калгасе «Будаўнік», Любаньскага раёна, толькі ніхто не клапоціцца аб арганізацыі культурна-масавай работы сярод яе. У калгасе быў раней клуб, у якім можна было зайсці, пачытаць кнігі, газеты, пагуляць у шахматы, шашкі. Старшыня калгаса Рубчэня Андрэй па нейкіх гаспадарчых меркаваннях клуб закрыў, цяпер у вольны час няма куды пайсці.

В. КЛІМЕНЯ.

Н. КРЭНКЕ
Доктар біялагічных навук.

ЧАРЛЬЗ ДАРВІН

(Да 55-годдзя з дня смерці)

19 красавіка 1882 года на 74 годзе жыцця, у вёсцы Даун, паблізу Лондана, памёр вялікі біёлаг Чарльз Дарвін, імя і вучэнне якога асталося несмяротным для чалавецтва.

Таварыш Сталін на першай усесаюзнай нарадзе стахановцаў сказаў: «Навука таму і называецца навукай, што яна не прызнае фетышаў, не баіцца падняць руку на аджываючае, старое і чуда прыслухоўваецца да голасу вопыту, практыкі». Ілюструючы гэта палажэнне, таварыш Сталін прадаўжае: «Калі-б справа абстаяла інакш, у нас не было-б наогул навукі, не было-б, скажам, астраноміі і мы ўсё яшчэ прабаўляліся-б абвяшчалай сістэмай Пталамея, у нас не было-б біялогіі, і мы ўсё яшчэ папяшаліся-б легендай аб стварэнні чалавека, у нас не было-б хіміі, і мы ўсё яшчэ прабаўляліся-б прадраканнямі алхімікаў».

Побач з Капернікам, Галілеем, Ньютонам можна назваць яшчэ некалькі вялікіх імёнаў, прымаўшых удзел у руйнаванні сістэмы Пталамея і ў стварэнні новай, сапраўднай астранаміі. Можна назваць рад геніяльных імёнаў, пабудаваўшых сучасную хімію. Але мы затрунімся пералічыць з кім-небудзь заслугу Чарльза Дарвіна ў руйнаванні біблейскай легенды аб стварэнні чалавека.

Вучэнне Дарвіна, зрабіўшае пераварот у разуменні паходжання і развіцця раслін і жывёлін, а таксама чалавека, сустрэла, падобна вучэнню Каперніка, рэзкае адлабленне царквы. І хоць у далейшым, аж да нашых дзён, былі спробы прымірыць дарвінізм з рэлігіяй, але апрача поўнай негрунтоўнасці гэтых спроб і сёння дарвінізм і царква — процілеглыя варожыя полюсы.

Асноваполажнікі дыялектычнага і гістарычнага матэрыялізма Маркс і Энгельс высока ацанілі эвалюцыйную тэорыю Чарльза Дарвіна. Ужо ў першай палове снежня 1859 года, гэта значыць неадкладна пасля выхаду славутай працы Дарвіна—«Паходжанне відаў шляхам натуральнага адбору або захавання ўдасканаленых парод у барацьбе за існаванне»,— Энгельс пісаў да Маркса: «Наогул-жа Дарвін, якога я якраз цяпер чытаю, надзвычайны. У гэтай галіне тэлеалогія не была яшчэ зруйнавана, а цяпер гэта зроблена. Апрача таго, да гэтага часу яшчэ не было такой грандыёзнай спробы паказаць гістарычнае развіццё ў прыродзе, ды яшчэ з такім поспехам» (К. Маркс і Ф. Энгельс. Твор, т. XXII. стар. 468).

У пісьме да Ласаля 16 студзеня 1861 года Маркс таварыў: «Вельмі вялікае значэнне мае работа Дарвіна, яна гадзіцца мне як прыродна-навуковая аснова гістарычнай барацьбы класаў» (К. Маркс і Ф. Энгельс, Тв., т. XXV, стар. 377). У першым-жа томе «Капітала» Маркс гаворыць аб «Паходжанні відаў», як аб рабоце, «зрабіўшай эпоху». Ленін таксама лічыў, што Дарвін «... упершыню паставіў біялогію на зусім навуковую глебу, устанавіўшы змяняемасць відаў і пераемнасць паміж імі...» (Ленін, Тв., т. 1, стар. 62).

У чым-жа сутнасць вучэння Чарльза Дарвіна? Для адказу на гэта пытанне неабходна ясна ўявіць сабе становішча вучэння аб арганізмах да моманту выступлення Дарвіна, найвялікшага рэвалюцыянера навукі XIX века, як яго назваў у пісьме да яго сучаснік Дарвіна — батанік Уотсон.

У той час у розумах натуралістаў амаль непадзельна панавала перакананне, выказанае яшчэ Лінеем (1707 — 1778), упершыню прывёўшым хоць і ў штучны, але ўсё-ж у некаторую парадак, у некаторую сістэму хаатычны анісальны матэрыял па расліннаму і, часткова, жывёльнаму свету. Ліней пісаў, што мы налічваем столькі відаў, колькі іх стварыла ў пачатку бясконная істота. Да Чарльза Дарвіна былі спробы стварыць эвалюцыйнае вучэнне аб развіцці жывой прыроды. Найбольш сур'ёзную тэорыю прапанаваў у 1809 годзе Ламарк у сваім вучэнні «Філасофія заалогіі». Аднак гэта тэорыя (ламаркізм) у яе цэлым не знайшла шырокага распаўсюджання, за малой доказнасцю яе довадаў, якія не пацвердзіліся і пасля.

Чарльз Дарвін асноўнае значэнне надаваў прыняццю прынцыпа пераемнай эвалюцыі арганізмаў. У другім з адзіных двух сваіх друкаваных палемічных выступленняў супроць крытыкі яго тэорыі Дарвін, упамінаючы некаторых з папярэніх яму эвалюцыяністаў пісаў: «З якімі імённа поглядамі згодзіцца натураліст—ці Ламарка, ці Жофруа, Сант-Ілера, або аўтара «Слядоў тварэння», або Уолеса і маімі, ці другімі такімі-ж — гэта няважна; важна толькі, каб ён прыняў, што віды паходзяць ад другіх відаў, а не былі створаны нерухома...

І вось Чарльз Дарвін геніяльна проста прадэманстраваў не толькі факт змены відаў шляхам іх развіцця, але і асноўную матэрыялістычную прычыну гэтага працэса.

Пры скромным падліку аказваецца, што, напрыклад, дзесятае палавое пакаленне адной расліны адуванчыка патрабавала-б для свайго размяшчэння плошчу, у 15 разоў перавышаючую паверхню сушы земнага шара. Але-ж на зямлі ёсць сотні тысяч розных відаў раслін і жывёл. Відавочна, выжыць можа толькі самая нязначная частка іх патомства. Выжываюць індывідуумы, якія аказаліся найбольш прыстасаванымі да даных умоў іх развіцця; астатнія гінуць у барацьбе за існаванне.

Розная прыстасаванасць арганізмаў да ўмоў іх існавання вызначаецца натуральнай зменлівасцю іх. Не адноўкавы асобныя індывідуумы адной расы; тым больш адрозніваюцца паміж сабой расы, рознавіднасці, віды і т. д.

Адхіленні могуць адбывацца ў вельмі рознастайных, хоць гістарычна і абмежаваных, напрамках. Адхіленні, якія аказаліся найбольш карыснымі арганізму ў даных умовах яго існавання, забяспечваюць яму выжыццё; адхіленні шкодныя — прыводзяць да смерці. Адбываецца натуральны адбор. З пакалення ў пакаленне, як правіла, выжываюць толькі крайнія—найбольш удалыя варыянты; адбываецца разыходжанне прызнакаў, па якіх ідзе адбор, і паступова ўтвараюцца новыя расы і віды.

Відазмяненае патомства, як больш дасканалае, г. зн. больш прыстасаванае да даных умоў, паступова выцясняе сваіх продкаў, і жывучыя цяпер віды абманліва прадстаўляюцца нашым вачам як віды, якія з'явіліся незалежна адзін ад аднаго. Толькі адносна рэдка наглядаюцца яшчэ пераходныя формы, якія захаваліся паміж імі. У сапраўднасці-ж усе арганізмы — як расліны, так і жывёлы — з'явіліся калісьці, у нязлічна далёкія часы, ад аднаго або — што вярней — ад нямногіх первічных элементарных жывых істот. Відома, і зараз адбываецца натуральнае ўтварэнне новых спадчынных форм арганізмаў з ужо існуючых. Больш таго, новыя расы, а ў радзе выпадкаў новыя віды і нават роды чалавек стварае эксперыментальна. Зразумела таксама, што звычайна (але ўсё-ж далёка не заўсёды) сучасныя, натуральна з'явіўшыяся арганізмы нам здаюцца складзенымі адзіўляюча мэтазгодна, з пункту погляду прыстасаванасці да ўмоў іх жыцця.

Іменна гэта і прыводзіла раней да ілжывага вучэння аб нематэрыяльнай «канечнай прычыне» развіцця, аб імкненні арганізмаў да пэўных дасканалых форм.

Ужо ў 1859 годзе ў «Паходжанні відаў» Дарвін пісаў, што дзякуючы яго тэорыі «святло будзе кінута на паходжанне чалавека і яго гісторыю». У 1871 годзе ён апублікаваў спецыяльную працу «Паходжанне чалавека і палавы адбор». Часамі прыпісваюць Дарвіну перанос яго асноўнай тэорыі — барацьбы за існаванне — на грамадскія адносіны чалавецтва. Многія ў рэакцыйных мэтах прабавалі зрабіць гэта за Дарвіна. Вядома, у Дарвіна не было правільнага ўяўлення аб законах, якія акрэсліваюць гэтыя адносіны. «Чарльз Дарвін адкрыў закон развіцця арганічнага свету на нашай планеце. Маркс — той, хто адкрыў асноўны закон, які вызначае рух і развіццё чалавечай гісторыі» (К. Маркс і Ф. Энгельс, Тв., т. XV, стар. 648). Але Дарвін хоць і запазычыў звярынае «грамадскае» вучэнне Мальтуса для растлумачэння натуральнага паходжання відаў арганізмаў, у тым ліку і чалавека, аднак ён прызнае якаснае адрозненне фактараў, вызначаючых далейшую эвалюцыю чалавека.

Той-жа факт, што чалавек паходзіць ад агульнага продка з малпамі і што так адварочвала многіх ад дарвінізма, ні ў якай меры не парушае нашага ластаўства. Дарвін, заключаючы сваю працу аб паходжанні чалавека, піша: «Што да мяне датычыць, я-б хутчэй жадаў быць патомкам адважнай маленькай малпы, якая не пабаялася кінуцца на страшнага ворага, каб выратаваць жыццё вартаўніка, або старога павіяна, які, спусціўшыся з гары, вынес з трыумфам маладога таварыша з натоўпу здзіўленых сабак, чым быць патомкам дзікуна, які асалодзваецца пакутамі сваіх непрыяцеляў, прыносіць крывавыя афіяры, забівае сваіх дзяцей без усякай згрызоты, абыходзіцца са сваімі жонкамі, як з рабынямі, не ведае ніякага сораму і аддаецца грубейшым забабонам». Да гэтага варта толькі дадаць, што пад дзікунамі неабходна разумець асоб іменна з падобнымі ўласцівасцямі, незалежна ад пасімага імі «культурнага» ярлыка. Тым больш, як гаворыць і сам Дарвін, спасылаючыся нават на малп, зусім непрычым тут раса. Такім чынам дарвінізм не дае рашуча ніякіх падстаў для дзікай расавай «тэорыі» фашызма. Гэта «тэорыя» базуецца не на біялагічных ланых, але на імкненні фашыстаў да эксплуатацыі сваіх іншаплямённых працоўных.

Як толькі дарвінізм стаў састаўной часткай марксісцкага светапогляду і тым самым увайшоў у філасофію класавай барацьбы пролетарыята, пануючыя класы, ужо ў саюзе з царквой, апалчыліся на вучэнне Дарвіна.

Аднак, як у Англіі, так і ў іншых краінах рад прыняпеляў і прыхільнікаў Дарвіна і яго вучэння (Гекслі, Гукер, Лайель, Аза Грэй, А. і В. Кавалеўскія, К. А. Тімірязеў, Д. І. Пісарэў, Э. Гекель і многія іншыя) сваёй гарачай прапагандай дарвінізма і сваімі работамі, адбіўшы варожы напіск, надзвычай садзейнічалі быстраму і моцнаму развіццю гэтага вучэння ў самых шырокіх колах.

Таварыш Сталін на першай усесаюзнай нарадзе стахановцаў указаў, што «Навука, парваўшая сувязі з практыкай, з вопытам ... даўно загінула-б для чалавецтва». Дарвінізм, ачышчаны ад чуждых яго сутнасці прымесяў, жыве, развіваецца і будзе жыць.



Чарльз Дарвін.

НА ФРАНТАХ У ІСПАНІІ

МАДРЫДСКІ ФРОНТ

ПАРЫЖ (сталіца Францыі), 16 красавіка. (БЕЛТА). Агенцтва Гавас перадае паведамленне камітэта абароны Мадрыда, апублікаванае сёння ў поўдзень. У паведамленні гаворыцца, што на заходнім участку мадрыдскага фронта рэспубліканцы, дзякуючы ралу ўдалых аперацый, палепшылі свае пазіцыі ў раёне ўзвышшаў Харабітас і Агіла.

***

МАДРЫД, 17 красавіка. (БЕЛТА). Генерал Міяха паведаміў сёння журналістам, што фашысты, засеўшыя ва Універсітэцкім гарадку, акружаны. Далей Міяха паведаміў, што ў сектары Эль Пардо (на паўночны захад ад Мадрыда) фашысты прапанавалі рэспубліканцам кароткае перамір'е на час уборкі сваіх трупаў. На гэта была дана згода. Фашысты ўбіралі трупы некалькі гадзін. Пасля гэтага перастрэлка адновілася.

ПАЎНОЧНЫ ФРОНТ

БІЛЬБАО (галоўны горад Баскскай аўтаномнай вобласці), 16 красавіка. (БЕЛТА). На біскайскім фронце, у раёне Уркіёла (на паўднёвы ўсход ад Більбао) мяцежнікі, атрымаўшы новыя падмацаванні, пры падтрыманні авіяцыі пачалі наступленне на занятую рэспубліканцамі горную пазіцыю Субіган (на поўначны ўсход ад Уркіёла).

Учора авіяцыя мяцежнікаў зрабіла налёт на Більбао. Праследуемыя рэспубліканскімі знішчальнікамі, самалёты мяцежнікаў скінулі над горадам 12 бомб. Забіта і ранена некалькі мірных жыхароў.

АРАГОНСКІ ФРОНТ

ПАРЫЖ (сталіца Францыі), 16 красавіка. (БЕЛТА). На арагонскім фронце ў сектары Санта Кітэрыя на бок рэспубліканцаў перайшло 120 салдат на чале з унтэр-афіцэрамі. Гэтыя салдаты складалі частку апошніх папаўненняў мяцежнікаў на гэтым фронце. У сектары Уэскі рэспубліканцы адбілі энергічную атаку мяцежнікаў на левым флангу пазіцый ля Ла Тораса.

У Сектары Тэруэль рэспубліканскія войскі занялі вёскі Вісілэо, Лідон, Архентэ і важную пазіцыю Серро Кордо. Праціўнік панёс значныя страты.

27 сакавіка ў Нью-Ёрку адбылася велізарная антыфашысцкая дэманстрацыя працоўных горада. НА ЗДЫМКУ: дзеці — удзельнікі дэманстрацыі. На транспаранце надпіс на іспанскай мове — «Далоў Гітлера!» (ОФ).

СУД НАД ЗАБОЙЦАМІ МАСТАКА Ю. М. ПЭНА

ДОПЫТ ПАДСУДНАГА ФАЙНШТЭЙНА АБРАМА

ВІЦЕБСК, 17 красавіка. (Кар. «Звязды»). Другі дзень судовага пасяджэння пачынаецца з допыту цэнтральнай фігуры працэса, непасрэднага забойцы Ю. М. Пэна — Файнштэйна Абрама. Гэты прайдзісвет адмаўляецца ад даных ім на папярэднім следстве паказанняў, у якіх ён поўнасцю прызнаў сваю віну.

— Я, — гаворыць ён, — быў усхваляваны тады і таму сказаў, што я забіў Пэна.

Старшыня: Скажыце, падсудны Файнштэйн Абрам, чым-жа тады растлумачыць, што, не будучы на месцы злачынства, вы на папярэднім следстве падрабязна расказалі аб дэталях забойства?

Гэта пытанне зрывае маску з твара забойцы і поўнасцю даказвае зробленае ім злачынства. У падсуднага пры вобыску знойдзена насавая хустка, запэцканая ў кроў. Сам Абрам Файнштэйн на папярэднім следстве заявіў, што, зарэзаўшы Пэна, ён выцер аб хустку запэцканыя ў кроў пальцы. Цяпер ён гэта ўсё адмаўляе, хустка, моў, аказалася запэцканай у кроў з той прычыны, што нібы ў 1936 г. у яго з носу ішла кроў.

Ён прызнае, што грошы сапраўды схаваў у сараі пад дровамі, але гэтыя грошы не Пэна, а, моў, заработак членаў сям'і Файнштэйна. Для чаго-ж тады патрабна было іх хаваць? Злачынца ў замяшанні. Штосьці незразумелае мармыча ён сабе пад нос.

Яшчэ больш выкрываецца Файнштэйн Абрам у часе допыту пракурорам т. Глезеравым. У часе гэтага допыту банька Абрама — Файнштэйн Рувім пацвярджае суду, што пры вочнай стаўцы з сынам Абрамам на папярэднім следстве апошні яму заявіў: «Так, я забіў Пэна».

Канчаткова падсудны выкрываецца допытам другога прадстаўніка абвінавачання пракурора т. Мінкіна. Адказваючы на пытанне пракурора, падсудны падрабязна выкладае суду ўсе дэталі забойства і расказвае, як яму ў гэтым дапамагала яго сястра Нэха.

Зусім забыўшы аб тым, што толькі 5 мінут таму назад ён поўнасцю адмаўляў сваю віну, зараз на судзе, падаючы дэталі забойства, Абрам выдаў сябе, што называецца, з галавой. І ўсе яго паказанні на поўнасцю сходзяцца з паказаннямі на папярэднім следстве і актамі судовай і медыцынскай экспертызы.

Мінкін: Дык усё, што вы зараз тут расказалі на судзе і на папярэднім следстве, гэта праўда?

Прыгвожданы да сценкі яўнымі доказамі, прад'яўленымі прадстаўнікамі абвінавачання, гэты падонак чалавечага грамадства, замяніўшы чэсную працу па бандытызм, апусціўшы галаву, адказвае:

— Так, праўда.

Пасля допыту Абрама выступае абаронца. Апошні дарэмна шукае змякчаючых віну акалічнасцей.

Абрам сам поўнасцю сябе выкрыў.

Допытам Абрама Файнштэйна заканчваецца ранішняе пасяджэнне суда.

АРК. ЗАРУБЕЖНЫ.

Пасяджэнне падкамісіі камітэта па неўмяшанню

ЛОНДАН (сталіца Англіі), 16 красавіка. (БЕЛТА). Пасля трохтыднёвых «канікул» адновіліся пасяджэнні падкамісіі камітэта па пытаннях неўмяшання ў справы Іспаніі. Доўгі перапынак быў выклікан пазіцыяй італьянскага ўрада, які, як вядома, вуснамі свайго прадстаўніка Грандзі на пасяджэнні 23 сакавіка заявіў, што «ні адзін італьянскі добраахвотнік не пакіне Іспанію да канца вайны». Паколькі пасля прыняцця камітэтам схемы кантролю (па сушы і моры) асноўным пытаннем, якое стаіць у паралку дня работы камітэта, з'яўляецца пытанне аб вывазе з Іспаніі так званых «добраахвотнікаў», то зусім відавочна, што пазіцыя, занятая італьянскім урадам у гэтым пытанні, рабіла бескарысным далейшы прагрэс работы падкамісіі. А паколькі, з другога боку, брытанскі і французскі ўрады думалі, што ў склаўшыхся абставінах самым лепшым выхадам са становішча было-б хадзіць каля «італьянскага тыгра» на цыпках, заклінаючы ўсіх, каб яго «не непакоілі», то пасяджэнні падкамісіі і камітэта аказаліся не толькі бескарыснымі, але і немагчымымі.

Але не ўсе дзяржавы, прадстаўленыя ў камітэце, глядзелі на справу так, як палітыкі ў Лондане і Парыжы.

У рэзультаце ўчора было склікана новае пасяджэнне падкамісіі. Цэнтральным пытаннем гэтага пасяджэння з'явілася пытанне аб вывазе «добраахвотнікаў» з Іспаніі. Тры тыдні ў нашы шпарка бягучыя дні — вялікі тэрмін. За гэты перыяд італьянскі ўрад, паспеўшы прыкінуць, падлічыць і параздумваць над еўрапейскай сітуацыяй, прыйшоў да высновы, што выхоўшы з камітэта па неўмяшанню, бразнуўшы дзвярыма, бадай, будзе некалькі рызыкоўна. Вось чаму Грандзі сёння на пасяджэнні падкамісіі заявіў, што «з прычыны агульнага паляпшэння атмасферы», італьянскі ўрад зараз гатоў прыступіць да абмеркавання пытання аб вывазе «добраахвотнікаў» з Іспаніі.

У рэзультаце падкамісія аднагалосна рашыла перадаць пытанне аб вывазе «добраахвотнікаў» на папярэднюю прапрацоўку ў камісію тэхнічных экспертаў. Які будзе далейшы ход падзей і ці з'яўляецца згода італьянскага ўрада на абмеркаванне данага пытання сапраўдным эрухам у палітыцы Мусаліні ў адносінах да Іспаніі, ці толькі тактычным ходам у мэтах выйгрышу часу, пакажа бліжэйшае будучае.

ХРОНІКА

У сувязі з увядзеннем у дзеянне ў ноч з 19 на 20 красавіка кантроля над выкананнем пагаднення аб неўмяшанні ў іспанскія справы, капітанам совецкіх суднаў, якія ідуць у іспанскія порты, даны ўказанні аб прыёме на борт наглядальнікаў кантрольнага камітэта да заходу суднаў у Іспанію і аб выкананні астатніх правіл, прадугледжаных пастановай аб увядзенні кантроля. (БЕЛТА).

Японская ваеншчына рыхтуе новую правакацыю

НЮ-ЁРК (буйнейшы цэнтр ЗША), 17 красавіка (БЕЛТА). Тут у журналістскіх колах узмоцнена гавораць аб падрыхтоўцы японскай ваеншчынай новай узброенай сутычкі на совецка-манчжурскай ці мангола-манчжурскай граніцы. Ваеншчына разлічвае скарыстаць гэты інцыдэнт у часе выбараў у японскі парламент у інтарэсах правых груп.

НА ШЛЯХУ ДА АДЗІНСТВА

ПАРЫЖ (сталіца Францыі), 16 красавіка. (БЕЛТА). Адбылося пасяджэнне камітэта па аб'яднанню комуністычнай і сацыялістычнай партый. Сёння орган компартыі «Юманітэ» друкуе артыкул Вайяна Кутур'е, у якім адзначаецца, што комуністычныя дэлегаты патрабавалі хутчэйшага ажыццяўлення аб'яднання з мэтай задаволіць пажаданні членаў абодвух партый. Прапанова комуністаў была спрыяльна прынята сацыялістычнымі дэлегатамі, патрэбаваўшымі, каб было правезена шырокае апытанне сярод членаў абодвух партый. Комуністы прынялі гэту прапанову і высунулі патрабаванне хутчэйшага апублікавання праектаў абодвух партый з тым, каб усе арганізацыі сацыялістаў і комуністаў маглі абмеркаваць гэтыя прапановы і выбраць дэлегатаў на канферэнцыю, якая павінна падрыхтаваць аб'яднанне.

***

МАДРЫД, 16 красавіка. (БЕЛТА). У артыкуле пад загалоўкам «Сацыялісты і комуністы» орган іспанскай компартыі «Мундо обрэро» вітае імкненне да аб'яднання комуністычнай і сацыялістычнай партый, падкрэсліваючы, што ўжо мелі месца сумесныя маніфестацыі абодвух партый у Валенсіі, Альбасетэ і Мадрыдзе і што вялуцца перагаворы аб поўным аб'яднанні. Газета ўказвае, што алянства пролетарскіх партый заўсёды было імкненнем компартыі і што аб гэтым зусім нядаўна заявіў на пленуме ПК іспанскай компартыі Хозэ Дыяс. Адзіная партыя пролетарыята ў Іспаніі, — піша газета, — справа бліжэйшага будучага.

ЗАБАСТОЎКА ПОЛЬСКІХ ГАРНЯКОЎ

ВАРШАВА (сталіца Польшчы), 17 красавіка. (БЕЛТА). Орган польскіх сацыялістаў (ППС) «Роботнік» паведамляе падрабязнасці забастоўкі 1.500 гарнякоў на шахце «Міхал» у Верхняй Сілезіі. Паводле слоў газеты, бастуючымі пад зямлёй гарнякамі 15 красавіка была аб'яўлена галаваўка. Даведаўшыся пра галаваўку, жоны гарнякоў з дзецьмі сфарміравалі калону, якая накіравалася да дома дырэктара шахты. Разбіўшы вокны дома, жанчыны пайшлі да будынка кіраўніцтва шахты, але тут іх перагаразілі дарогу паліцэйскі атрад. Паміж паліцыяй і дэманстрантамі адбылася сутычка. У гэты-ж дзень увечары, як паведамляе «Роботнік», забастоўка гарнякоў на шахце «Міхал» закончылася перамогай рабочых.

КАНФІСКАЦЫЯ ЗБРОІ У ФРАНЦУЗСКІХ ФАШЫСТАЎ

ПАРЫЖ (сталіца Францыі), 16 красавіка. (БЕЛТА). Орган компартыі «Юманітэ» паведамляе аб канфіскацыі зброі ў членаў фашысцкіх арганізацый. У Монпелье паліцыя знайшла пры вобыску ў члена фашысцкай арганізацыі 30 аўтаматычных пісталетаў, 1.500 патронаў, дзве гранаты і т. д.

У Рош сюр Форон паліцыя выявіла 150 аўтаматычных пісталетаў германскай вытворчасці ў аўтамабілі, за рулём якога быў фашыст, які належаў да «французскай сацыяльнай партыі» (над шыльдай гэтай партыі хаваюцца «Баявыя крыжы»).

У РЭДАКЦЫЮ ГАЗЕТЫ „ЗВЯЗДА"

Тав. рэдактар!

У маім выступленні на сходзе партарганізацыі Наркомасветы, частка якога надрукавана ў артыкуле «Да канца выкрыць і выправіць памылкі» («Звязда» ад 9 красавіка), побач з выкрытымі ворагамі, як Ігнатоўскі, Баліцкі, гаворыцца аб Платуне. Нам стала вядома, што т. Платун з'яўляецца членам комуністычнай партыі і працуе начальнікам палітадзела ў Заходняй Сібіры. Зусім ясна, што т. Платуна нельга было ставіць у адзін рад з Ігнатоўскім і іншымі ворагамі народу. (Гэта, зразумела, не знімае з т. Платуна адказнасці за засмечанасць апарата Наркомасветы варожымі элементамі ў часе яго работы ў наркамаце).

Прызнаю гэту сваю памылку і прашу прабачэння ў чытачоў «Звязды».

Прашу рэдакцыю паведаміць чытачам «Звязды» аб гэтай маёй памылцы.

ЛАПІДУС.

ПІСЬМО У РЭДАКЦЫЮ

У «Звяздзе», а потым у «Палескай праўдзе» апублікавана «Пісьмо з Гомеля» наконт заключнага слова тав. Галадзеда на партыйным актыве Гомельскай арганізацыі КП(б)Б.

Мы катэгарычна супярэчым супроць скажэння нашых прозвішчаў, як аўтараў данай заметкі. Напісана: «Галаміет і Ганчарэнка» ў той час, калі нашы сапраўдныя прозвішчы — Каламіец і Аўчарэнка.

П. КАЛАМІЕЦ.

ПАВЕТРАНЫЯ ЗНОСІНЫ МЕНСК—МАСКВА

Галоўнае кіраўніцтва грамадзянскага паветранага флота аднаўляе паветраныя пашгова-грузавыя зносіны Масква—Менск—Масква. Лінія адкрыецца ў пачатку мая.

ВЫРАБ ЛЕТНЯГА АБУТКУ

МАГІЛЕЎ. Чатыры абутковых арцелі магілеўскага скурпромсаюза (у Магілеве, Оршы, Рагачове і Дуброўне) сёлета значна пашыраюць выпуск летняга абутку. Будзе выпушчана 50 тысяч пар паленшанага парусінавага абутку, замест 40 тыс. пар летась, і 65 тыс. пар спартыўных балетак, замест мінулагодніх 50 тыс. пар. Палова гэтай колькасці абутку будзе выпушчана ў II квартале. Скуранога дзіцячага абутку арцелі выпусцяць 69 тыс. пар. (БЕЛТА).

Ад Рэчыцкага РК КП(б)Б

Згубленым — партыйны білет узору 1936 года за № 0566134, выданы ПК КП(б)Б на імя Шпакоўскага Канстанціна Іванавіча, і кандыдацкую картку ўзору 1936 года за № 0551940, выданую ЦК КП(б)Б на імя Дарафеева Мікалая Іванавіча, лічыць несапраўднымі.

Сакратар Рэчыцкага РК КП(б)Б МАЛІНІН.

Ад Быхаўскага РК КП(б)Б

Украдзены партыйны білет, выданы Быхаўскім РК КП(б)Б на імя Багінскага Мар'яна Карлавіча за № 0860702, лічыць несапраўдным.

Сакратар Быхаўскага РК КП(б)Б ІГНАТОВІЧ.

ДЗЕННІК

— Лекцыя для прапагандыстаў і агітатараў Кагановіцкага раёна на тэму «20-годдзе Красавіцкіх тэзісаў В. І. Леніна» адбудзецца 19 красавіка ў 7 гадзін вечара ў Доме тэхнікі (Комсамольская, 23).

— Чарговыя заняткі для слухачоў гурткоў па ленінізму і гісторыі ВКП(б) адбудуцца 19 красавіка ў 7 гадзін вечара ў Доме партактыва.

Адказны рэдактар Д. В. ЮРКОЎ.

ДА ПЕРШАМАЙСКІХ СВЯТ

У МАГАЗІНЫ „ГАСТРАНОМ" і „БАКАЛЕЯ"

пастуПілі вялікія партыі тавараў

КАЎБАСА ўсіх гатункаў, ВЕТЧЫНА.

РЫБАПРАДУКТЫ, КАНСЕРВЫ, СЕЛЯДЦЫ.

МАСЛА, СЫРЫ.

МУКА, КРУПЫ, ЦУКАР, ЧАЙ, КОФЕ.

КАНФЕТЫ, ПЯЧЭННЕ, ВАРЭННЕ, ШАКАЛАД, КАКАО.

ТАРТЫ, КЕКСЫ, БАБКІ, ПІРОЖНЫЯ (уласн. вырабу).

Лепшы выбар ВІН, ТАБАЧНЫХ вырабаў.

Дзіцячыя першамайскія падарункі

Усе магазіны прымаюць заказы з ДАСТАЎКАЙ НА ДОМ.
Карыстайцеся паслугамі СТАЛА ЗАКАЗАЎ.
НЕ ТРАЦЦЕ ЧАСУ каля прылаўкаў і кас.
Прымаюцца заказы для ВЕЧАРОЎ.
Усе магазіны з 15 красавіка ПАВЯЛІЧЫЛІ ЧАС ГАНДЛЮ на 2 гадзіны

ЗАПОМНІЦЕ АДРАСЫ НАШЫХ МАГАЗІНАЎ:
МАГАЗІН № 1 — Совецкая, 66 (супроць ГУМа), тэл. 21-251.
МАГАЗІН № 2 — Совецкая, 24 (супроць Дома ўрада), тэл. 24-907.
МАГАЗІН № 3 — Ленінская.
МАГАЗІН № 4 — Ленінская, 36, тэл. 24-652.
МАГАЗІН № 14 — Гарбарная, тэл. 21-200.
МАГАЗІН № 15 — Ленінская, 10, тэл. 20-994.
МАГАЗІН № 16 — Маскоўская, тэл. 21-621.
Магазіны «ГАСТРАНОМ» і «БАКАЛЕЯ» існуюць таксама ў гарадах Віцебску, Гомелі, Магілеве і Бабруйску.

ДЫРЭКЦЫЯ БЕЛ. АДДЗ. «СОЮЗПРОДМАГА».

Сцягі, наканечнікі, кісці, шнур і партрэты правадыроў.

ПІОНЕРСКІЯ і СПАРТЫЎНЫЯ СНАРАЖЭННІ,

АБУТАК і ШВЕЙНЫЯ ВЫРАБЫ

АТРЫМАНЫ у вялікім выбары ДА ПЕРШАМАЙСКІХ СВЯТ

Магазінам „ПІОНЕР" Совецкая, 60.

МАГАЗІН АДКРЫТ з 10 г. раніцы да 7 гадзін вечара.

ДЫРЭКЦЫЯ.

ДА ВЕДАМА НАСЕЛЬНІЦТВА

Для лепшага абслугоўвання пакупнікоў ДА НАДЫХОДЗЯЧЫХ СВЯТ 1 МАЯ

Менсаюзунівермаг і дзіцячы філіял

з 16 да 30 красавіка ПАВЯЛІЧЫЛІ ЧАС ГАНДЛЮ на 2 гадз.,

г. зн. з 10 г. раніцы да 9 г. 30 мін. вечара. (без выходных дзён)

ДЫРЭКЦЫЯ.

УВАГА! УВАГА!

Менская кантора БЕЛПРОМГАНДЛЯ

ДЛЯ ЛЕПШАГА АБСЛУГОЎВАННЯ ПАКУПНІКОЎ У ПРАДСВЯТОЧНЫЯ ПЕРШАМАЙСКІЯ ДНІ З 15 ДА 30 КРАСАВІКА

ПАВЯЛІЧЫЛА ГАДЗІНЫ ГАНДЛЮ

ПА ЎСІХ МАГАЗІНАХ НА 2 ГАДЗІНЫ.

УСЕ МАГАЗІНЫ ПА ЖАДАННЮ ПАКУПНІКОЎ ДАСТАЎЛЯЮЦЬ КУПЛЕНЫ ТАВАР НА ДОМ БЯСПЛАТНА.

МАГАЗІНЫ ГАРАНТУЮЦЬ ЯКАСЦЬ ТАВАРАЎ.

ДЫРЭКЦЫЯ.

ДАВОДЗІЦЦА ДА ВЕДАМА ЎСІХ УСТАНОЎ, ЯКІЯ АТРЫМЛІВАЮЦЬ ПАЛІВА Ў ГАРТОПЕ, што з 19 красавіка ПАЧЫНАЕЦЦА

ВЫДАЧА УСТАНОВАМ ПАЛІЎНЫХ КНІЖАК

НА 1937/38 АЦЯПЛІЦЕЛЬНЫ СЕЗОН.

ПРЫ АТРЫМАННІ НОВЫХ КНІЖАК НЕАБХОДНА ПРАД'ЯВІЦЬ ДАВЕРАНАСЦЬ УСТАНОВЫ І СТАРУЮ КАРТКУ.

З 25 КРАСАВІКА ВЫДАЧА ПАЛІВА ПА СТАРЫХ КАРТКАХ ПРАВОДЗІЦЦА не БУДЗЕ.

ВЫДАЧА ПРАВОДЗІЦЦА Ў ПАМЯШКАННІ ГАРТОПА, вуліца Калініна, 5, з 5 да 10 гадзін вечара.

АДМІНІСТРАЦЫЯ ГАРТОПА.

БЕЛАРУСКІ ПЕРШЫ ДЗЯРЖАЎНЫ ТЭАТР (БДТ-1)
18 красавіка Абан. № 87.
АПОШНІЯ.

Памяшк. Дзярж. Ураўск. тэатра | БЕЛДЗЯРЖТЭАТР ОПЕРЫ І БАЛЕТА
18 красавіка КАПЕЛІЯ

Гукавы кінотэатр «ЧЫРВОНАЯ ЗОРКА» ТОМ СОЙЕР

Гукавы кінотэатр «Пролетарый» НАЗАР СТАДОЛЯ

Гукавы кінотэатр «ІНТЭРНАЦЫЯНАЛ» «БРАТАРЬ»

Дзіцячы гукавы кінотэатр ЮНАЦТВА МАКСІМА

Гукавы кінотэатр «Спартак» МАРЫЯНЕТКІ

РАДЫЁПЕРАДАЧЫ НА 19 КРАСАВІКА:
16.00 — канцэрт артыстаў Абрамана і Пантрагіна. 18.30—артыкулы «Праўды». 19.00—развучванне песень да Першамайскіх свят. 19.20 — аперэта «Фіялка Монмартра». 20.30—завочная партвучоба. 21.45 — сімфанічны канцэрт. 23.00 — «Апошнія паведамленні». 23.15 — «Апошнія паведамленні» на польскай мове.

У АДДЗЕЛ АБ'ЯЎ ЗВАНІЦЕ ПА ТЭЛЕФОНУ № 21-845

КІРАЎНІЦТВА СЯЦЕЙ г. МЕНСКА

ПРАПАНУЕ ЎСІМ ПРАДПРЫЕМСТВАМ І УСТАНОВАМ, ЯКІЯ НАМЯЧАЮЦЬ ЗРАБІЦЬ

ІЛЮМІНАЦЫІ да першамайскіх свят,

ПРАДСТАВІЦЬ НЕ ПАЗНЕЙ 21 КРАСАВІКА г. г. У АДДЗЕЛ АБАНЕНТАЎ КІРАЎНІЦТВА (Совецкая, 110) наступныя весткі:
1. Назва арганізацыі і адрас.
2. Колькасць і магутнасць маркуемых да ўключэння кропак.
3. Ці маркуецца ўключэнне ілюмінацыі па шчотчыку, ці апарата шчотчыка.

На наладжванне ілюмінацыі павінен быць выбран дазвол кіраўніцтва сяцей па ўстаноўленай форме да 23 красавіка г. г. Ілюмінацыі, уключаныя без дазволу, будуць зараз-жа выключаны і віноўныя ў іх уключэнні прыцягнуты да адказнасці.

КІРАЎНІЦТВА СЯЦЕЙ.

НА ПАДСТАВЕ ЗАГАДУ НАРКОМА КОМУНАЛЬНАЙ ГАСПАДАРКІ БССР АД 27 САКАВІКА 1937 ГОДА ЗА № 60

МЕНСКІ ЭНЕРГАКАМБІНАТ

З 1 КРАСАВІКА г. г. СПЫНІЎ СВАЮ ДЗЕЙНАСЦЬ.

Усе спажыўцы электраэнергіі па пытаннях далучэння да электрасеткі, разлікам за электраэнергію і т. д. ПАВІННЫ ЗВЯРТАЦЦА Ў НОВААРГАНІЗАВАНАЕ

КІРАЎНІЦТВА СЯЦЕЙ г. МЕНСКА

ПА АДРАСУ: г. МЕНСК, СОВЕЦКАЯ, 110.

КІРАЎНІЦТВА СЯЦЕЙ.

Пастановай агульнага схода акцыянераў А/Т Крэдытбюро ад 31 сакавіка 1937 г.

акцыянернае таварыства КРЭДЫТБЮРО падлягае ліквідацыі.

Для працягу дзейнасці А/Т Крэдытбюро створан калектыў

„ИНЮРКОЛЛЕГИЯ"

пры Маскоўскай калегіі абаронцаў, да якога пераходзяць увесь актыў і пасіў, а таксама ўвесь партфель кліенцкіх спраў з усімі правамі і абавязкамі перад кліентамі і іншаземнымі карэспандэнтамі і перад усімі трэцімі асобамі.

Адрэс калектыва абаронцаў «Инюрколлегия»: Москва, Неглинная, 12, помещение 6. А/О Кредитбюро. Главный почтамт, почтовый ящик № 963.

СПРАВЫ ЗА ГРАНІЦАЙ совецкіх грамадзян

Аб рэалізацыі спадчыны, атрыманні банкаўскіх укладаў, замежных каштоўных паперэ, рэалізацыі прэтэнзій да асоб і арганізацый за граніцай, як напрыклад: аб пакінутай маемасці, прэтэнзіі да былой Кітайска-Усходняй чыгункі і інш.

ВЯДЗЕ замест был. А/Т КРЭДЫТБЮРО „ИНЮРКОЛЛЕГИЯ".

Звяртацца па адрасу: Менск, упаўнаважаны «Инюрколлегии», памяшканне Дзяржбанка, былой Крэдытбюро.

Можна таксама звяртацца ва ўсе аддзяленні Дзяржбанка на месцах.

ГАТУНКОВАЕ НАСЕННЕ

ТРАЎ КАНЮШЫНЫ, КОРАНЬПЛОДАЎ, ГАРОДНЫХ КУЛЬТУР і КВЕТАК



МЕНСКАЯ БАЗА ДЗЯРЖСОРТФОНДА

(г. Менск, Козырава, Германаўская вуліца, дом № 1)

ПРАДАЕ праз свае ЛАРКІ

ПРОДАЖ праводзіцца без абмежаванняў па дзяржаўных цэнах УСІМ

У МЕНСКУ (на рынках — Крытым, Чэрвеньскім, плацы 25 Кастрычніка, Суражскім і Конным базары),
У ВІЦЕБСКУ (Чырвонаармейская, 23) і
У ПОЛАЦКУ

АБ ЦЭНАХ на насенне можна даведацца таксама і па тэл. 20-972.
К ПРАДСТАЯЧАМУ КАЛГАСНАМУ КІРМАШУ — З 25 ПА 30 КРАСАВІКА ЛАРКІ ПАПАЎНЯЮЦЦА АСАРТЫМЕНТАМ УСЯГО НАСЕННЯ.

Друкарня газеты «Звязда», Менск, Совецкая, 63.

Уп. Галоўлітбела № К—2065. Б., К., С.